Papildinajums.

S. Sacharows.

Latgales baltkrievu tautas gara mantas.

Rīgā

1940. g.

Papildinājums.

# НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЬЦЬ ЛАТГАЛЬСКАГА БЕЛАРУСА

Записы зроблены С. П. Сахаравым і іншымі асобамі ў 1938-1939 г.г.

Latvijas Universitātes BIBLIOTEKA

Ls 60.—

Rīgā.

1939 g.

1939: 2415. 47



"   "

"

Настоящее дополнение к сборнику „Народная творчасьць Латгальскага беларуса" является, главным образом, в результате моих двух поездок по Латгалии летом 1938 и 1939 г.г.
В первую поездку я посетил Пэдрускую и Пустынскую волости, Даугавпилского уезда. Тут на ст. Indча я отыскал старуху в бол... Агату Невяровскую, от которой записал ряд песень. Кроме того в Пустынской вол. нашел несколько готовых записей от своих бывших учеников. Много записей белорусского народного творчества передал мне б. белорусский учитель Николай Шаперко как своих собственных, так и своих учеников.
Летом 1939 г. мною была совершена поездка в глухую деревню Шушки, Шкавенской, б. Ляндскоронской вол., Лудзенского уезда, заселённой преимущественно белорусами и теперь разбитой на хутора.
Здесь между другими мне пришлось встретить старушку-нищенку Викторию Дамчонак, 80 лет, которая снискивала себе пропитание тем, что ходила по крестьянам и пела белорусские песьни. Где свадьба, где

похоронят, где кирмаш, В. Дамчонак всюду являлася желанною гостьею. Репертуар у нея обширный и память хорошая. Мне удалось записать от нея свыше 70 народных белорусских песень. Сейчас она слепая и живет на иждивении своей замужней дочери.
В дер. Шушки я попал как раз в жнивную пору и с большим удовольствием слушал как на поле одного крестьянина П. Марчонка женщины и девицы пели белорусские жнивные песьни. Тут-же я их несколько записал.
По моему поручению одна из моих бывших учениц по Даугавпилской белорусской гимназии Антонина Лукашевич сделала ряд записей в различных деревнях Букмуйжской-Вайводовской волостях, Резекнеского уезда, где также проживает много белорусов.
Сделаны мною записи и в других местах.
Одновременно мной составляется словарь Латгальского белоруса, здесь-же прилагаю объяснение только некоторых слов с белорусского языка на латышский и русский языки.
У дадатак вошли варианты некоторых песень, чтобы отметить распространение белорусской песьни в Латгалии. С этою целью мной записа

вались сходные, подобные песни, но в различных местностях.

В настоящее дополнение вошли следующие песни

1. Калядныя — 4
2. Валачобныя - 1
3. Вяснавыя - 8
4. Карагодныя (хороводные) 8
5. Купальскіе — 31
6. Жнивные 35
7. Прыказки - 9
8. Восеньскія, талочныя 10
9. Хрэзьбінныя. дзіцячыя 17
10. Вясельныя (свадебные) 101
11. Хаутурныя (похоронные) - 2
12. Сямейна-бытавыя - 10
13. Рочныя 24

6

14. Загадкі — 7
15. Замовы — 3
16. Апавяданьні — 7.

Усяго 277

С. Сахарау

Rīga, Katoļu iela, № 33,
dz. 11

21. janvarī 1940. g.

# Калядныя, валачобныя, карагодныя, вяснавыя, купальскія, жніўныя, восеньскія і талочныя песьні.

## Калядная песня

Ды хадзілі, гулялі калядоўшчыкі,
Коляда, Коляда (прыпеўка),
Ды сачылі, пыталі багатага двара,
Багаты двор - Пятроў дом.
Каля яго двара усе шаўковая трава,
Усе шаўковая трава, усе зялёныя тычы,
Слупы (стаўбы) тачоныя, пазалачоныя
Вароцікі серэбраныя
Падваротніцо зыб"е рыб"е,
Зашчэпачкі медзяныя,
На яго двару ды тры церамы стаяць
У першым цераму ясен месяц,
Другі цярэм - ясна зара,
Трэці цярэм - дробны звёздачкі,
Чацверты цярэм - буен вецер.
Ясен месяц - сам гаспадар,
Ясна зара - яго жана,
Дробны звёздачкі - яго дачушачкі,
Буен вецер - яго сыны,
Самаго гаспадара дома німа,
Паехаў ён суды судзіць і рады радзіць,
накупляў ён гасцінчыкаў,
Жане купіў куню шубу, бугроў каўнер,
Каля ворота усе золата
Каля падолля усе саболя;
Дачушкам купіў па вяночку,
Па вяночку пярловаму, па платку шаўковаму,
Сынам купіў па коніку, па вараненьку
Па уздзе купіў па залатой,

Сабе купіў залот персьцень,
На правую ручку, на мізеня палец.
Самаго гаспадара дома німа,
Паехаў у Тэн горад,
Рыбку лавіць красна крылачишку,
Трахнуў-махнуў правай рукой,
Зраніў (скінуў) званіў залот персьцень,
С правай рукі з мізенага пальца;
Яго жана дасужная
Закінула тры невада, тры шаўковыя
Ня ўлавіла-ж яна залот персьцень,
Улавіла яна трох акунёў,
Злата перэжыкіх, златакрыленькіх,
Павязла-ж яна іх на торг таргаваць,
акунеў прадаваць.
За адзін акунь па сто рублёў
За другі акунь па тысячы.
Трэцяму акуню цаны німа
Яго цана ў государа на масьце (мост)
У государа на масьце, у Пятра на стале,
на століку, на дубовенькім
На скацерці, на шаўковенкай,
на тарэлачкі фарфуровенкай,
Ён пакачываець, паварачываець,
Залатой казной ён пабразгываець.
Ты, Петрачка, сам гаспадар
Жана твая гаспадыня.
Дарыце гасцей, не байце басцей (баень),
Гэты госьці ня частыя,
У гадочак толькі разочак;
Ня хочаш дарыць, пайдзем з намі,
Сьнягі таптаць, сабак дражніць
Людзей сьмяшыць

Запісаў С. Н. Сахараў 1 жніўня 1934 г.
ад Вікторыі Дамчонак, 80 г. сьляпой, у
в. Щушково, Шкавенскай вол. Лудзенск. пав.

# Калядныя песьні

Ты козанька, ты шэрая.
Каляда каляда (прыпеўка)
Ты лезь далоў
Ня бойся мяне
Ня звем цябе
Ты воўчэнька, ты шэрэнькі,
Баюся цябе, зьясі мяне
Ты козанька, ты шэрая
Я ў караля быў, я хлеб мясіў;
Ты козанька, ты шэрая
лезь далоў, ня бойся мяне
ня звем цябе,
Я ў караля быў, я глазам сьвяціў
– Баюся цябе, зьясі мяне!
Ты козанька, ты шэрая
Ня бойся мяне, ня звем цябе.
Ты лезь далоў,
Я ў караля быў, хвастом печы мёў
Языком хлеб садзіў, а глазам сьвяціў.

— " —

Запісаў 1 жніўня 1939, С. П. Са-
хараў ў в. Шушкова; Шкавенскай вол.
Лудзенскага пав. ад Вікторыі Дам-
чонак, 80 год.

## Калядовая песьня

Пашла каза ў варэхі
Нет казы з арэшкаў (2 разы)
Пастой-жа каза, пашлем на цябе ваўка,
А воўк нябудзець казу ганяць
Нет казы з арэшкаў (2р)
Пастой-жа воўк, пашлем мы на цябе стральцоў;
Стральцы ня йдуць ваўка стрэліць,
Воўк ня йдзе казу ганяць,
Каза ня йдзе лазы гладаць,
Нет казы з арэшкаў (2р)
Пастой-жа стральцы, пашлем на вас мядзьведзя
Мядзьведзь ня йдзець стральцоў біць,
А стральцы ня йдуць ваўка страляць,
А воўк нябудзець казы ганяць,
А каза ня йдзець лазы гладаць
Нет казы з арэшкаў (2р)
Пастой-жа мядзьведзь, пастой на мядзьведзі,
пашлю сіьле (сілу) мядзьведзя давіць!
Сіьле ня йдзе мядзьведзя давіць
Мядзьведзь ня йдзець стральцоў біць,
А стральцы ня йдуць ваўка страляць,
А воўк ня йдзець казы ганяць,
А каза ня йдзець лазы гладаць,
Нет казы з арэшкаў (2р)
Пастой-жа сіьле, пашлем на цябе агонь!
агонь ня йдзе сіьле жечь,
Сіьле ня йдзе мядзьведзя давіць
Мядзьведзь ня йдзець стральцоў біць,
А стральцы ня йдуць ваўка страляць,
А воўк ня йдзець казы ганяць,
А каза ня йдзець лазы гладаць,
Нет казы з арэшкаў (2р)
Пастой-жа агонь, пашлем на цябе ваду
Вада ня йдзе агоня тушыць,
агонь ня йдзе сіьле жечь
Сіьле ня йдзе мядзьведзя давіць.

# Калядовая песня
## (працяг)

Мядзьведзь ня ідзець стральцоў біць,
А стральцо ня ідуць ваўка стралять,
А воўк ня ідзець казы ганяць,
А каза ня ідзець лазы гладаць
Нет казы з арэшкаў (2 р.)
Пастой-жа вада, нашлем на цябо быка!
Бык ня ідзе ваду піць,
Вада ня ідзе агонь тушыць,
агонь ня ідзе сільле жечь
Сільле ня ідзе мядзьведзя давіць
Мядзьведзь ня ідзець стральцоў біць
А стральцо ня ідуць ваўка стралять,
А воўк ня ідзець казы ганяць.
А каза ня ідзець лазы гладаць
Нет казы з арэшкаў. (2 р.)
Пастой-жа бык, нашлем на цябе нажык!
Пайшоў нажык быка рэзаць
Пайшоў бык ваду піць,
Пайшла вада агонь тушыць,
Пайшоў агонь сільле жечь,
Пайшло сільле мядзьведзя давіць,
Пайшоў мядзьведзь стральцоў біць
Пайшлі стральцы ваўка стралять
Пайшоў воўк казу ганяць,
Пайшла каза лазу гладаць
Прышла каза з арэшкаў (2 р.)

Запісаў С. П. Сахараў 1 жніўня 1939 г.
у в. Шушкова, Шкавенскай вол., Лудзенска-га пав., ад Вікторыі Дамчонак, 80 год

# Калядовая песьня
(Сьпяваецца і восеньню)

Дзе быў казёл? ду-ду (прып.) Сена касіў.
На што сена? .. .. Кароў карміць
На што каровы? .. .. Малако даіць
На што малако? .. .. Пастухоў карміць
На што пастухі? .. .. Сьвіней пасьціць
На што сьвіньні? .. .. Горы рыць.
Што ў тэй горы? .. .. Ступа зялезная
Што ў тэй ступе? .. Лыжка цыноўная (цынковая)
Што ў тэй лыжкі .. .. Макава зярошка.
А дзе тое зярошка? .. .. Пятух склюваў.
А дзе пятух? .. .. На мора паляцеў.
А дзе мора? .. Кветкамі зарасло
А дзе кветкі? .. Дзеўкі павышчыпалі
А дзе дзеўкі? .. .. Замуж павыйшлі.
А дзе іхнія мужы? .. .. На вайну пайшлі
А дзе вайна? Там дзе татары
А дзе татары? .. .. Як ехалі татары,
Мусар растапталі

—— " ——

Запісаў 1 [illegible] 1939 г. С. Н. Сахараў, ч. в. Шушкова, Шкавенскай вол., Лудзенскага пав. ад Вікторыі Дамчонак, 80 год.

# Валачобная песьня.

Ідзем, пайдзем у слаўны дом,
Хрыстос Сын Божа, Хрыстос! (прыпеўка хорам)
Сьпяем песьню самому тому
Пану гаспадару, слаўну мужу
І з жаною маладою.
Пане гаспадару, устань рана,
Мыйся бела як папяра,
Сядзь пад вакном на ўсход сонца,
Глянь на двор,
Што дзеецца, лялеецца,
Ды на двары шацер стаіць навюсенькі,
А ў тым шатры прыстол стаіць.
Ля прыстолу крэсла стаіць.
А ў тым крэсле сам Бог сядзіць,
Каля Бога усе сьвятыя
Шануюцца, радуюцца.
Каторыму сьвятцу уперад ступіць.
Ясен красен уперад пайшоў,
Пасьля таго сьвяты Казімір
Дровы сячэ і ў клад кладзець,
Сьвята Благавешчаньне жытцо руніць,
Хоць пад сьнежком з божым духам,
Сьвята вербніца вербу ломіць
У касьцел нясуць пасьвянцаваць,
Чысты Чацьверг - ачышчаець,
Сьвяты Вялікадзень - разгаўляюцца
З чырвоным яйкам, з божым слаўцам
З белым сырам, з малым сынам,

Сьвята Праводнія,
Дай-жа Божа, мае дзеткі,
Гэта сьвяціца праваджаці
І другога дачакаці,
Сьвята Радаўніца-садаўніца
Сады садзіць, паліваець,
Сьвяты Юрэй ключнік Божы,
Асядлаў каня варанога
А сядзельца залатое,
Узяў ключы залатыя,
Паехаў у поле, адамкнуў зямлю,
Пусьціў расу мядовую,
А травіцу шаўковую;
Сьвяты Мікола - з сеўбой у поле,
Сьвяты Барыс, збожжа павысіць,
Сьвяты Шостнік, колас точыць,
Выплываць хочаць.
Сьвята Тройца, у лес ідзець,
Май ламаюць, май устаўляюць,
Сьвяты дзевятнік па межах ходзіць,
Зелкі рвець, вянкі віець;
Сьвята дзесятнік у жыце пятка,
Сьвяты Іван і вам, і нам;
Сьвята Пятро у жыце ядро;
Сьвята Ільля спара жнея,
Што раз махнець,
Снапок нажнець,
Што снапочак, то бабачка

Што бабачка, то копачка,
Сьвята Прачыстая ў полі урачыста,
Сьвяты Зьмітры, за ўсіх хітры,
Піва варыць, жану поіць,
Сыноў жэніць, дачок выдаець,
Пасаг даець:
А сыночку - па канечку,
А дачушцы - па кароўцы,
Сьвяты Пакроў, з поля дамоў,
Зямлю ледам пакрываець,
Пчолку медам,
Дзеўку вянком, бабу чапцом.
Пане гаспадару, маесьці кладку,
Зави ў хатку,
Гэты госьці не часта ходзяць.
Мала просяць, раз у гадок:
Пачынальніку чырвон злоты
Ды на боты,
А маім братом хоць па дзеяніку

———— " ————

Запісаў матурыст Дзьвінскае дзяр-
жаўнае беларускае гімназіі Язэп
Качло ад старушкі Аўдзьлі
у м. Рызе, у жніўні 1938 г.



# Карагодная песня

У гародзе, у гародзе чырвоная рожа (по 2р)
По тэй рожы, па тэй рожы дзяўчына гуляла,
Ты, дзяўчына чарнаброва, цябе маці клічаць.
– Знаю, знаю разумею,
За што мяне маці клічыць,
Яна хочыць мяне за старога аддаці,
А я старога даўно ня любіла,
Увёўшы ў хату дымам напаіла (раней былі Курныя хаты)
За вароты палкай прапусьціла,
На яго след камень накаціла.
Ідзі, стары, ні агледайся
На мяне маладу ні спадзявайся

У гародзе, у гародзе чырвоная рожа,
По тэй рожы дзяўчына гуляла,
– Ты, дзяўчына чарнаброва, цябе маці клічаць
– Знаю, знаю разумею,
За што яна клічыць,
Хочаць маці мяне за маладога аддаці,
Я маладога даўно палюбіла,
Увёўшы ў хату мёдам напаіла,
За вароты скрыпкай прапусьціла,
На яго след персцень накаціла.
– Ідзі малады агледайся,
На мяне маладу спадзявайся

Запісаў С. П. Сахараў 1 жніўня 1939 г. ад Вікторыі Дамчонак, 80 г., ув. Шушкова, Шкавенскага вол. Лудзенскага пав.

# Карагодная песьня

У харавадзе былі мы,
Ай люлі, ай люлі (прып.)
Дык каго-ж мы там відзелі,
Мы відзелі парачку,
Ета пара хараша
Дык ня стоіць ні гроша,
Устань пара прыбадрыся
Улева, управа павярніся
Хоць трохі пратанцуй,
Каго любіш - пацалуй

——— " ——— " ———

Ці ня відзеў, ці ня бачыў
Маладой дзяўчынкі,
Хоць і відзеў, хоць і бачыў,
Ня буду казаці;
Запрагайце пару коні
Паедзем шукаці,
Як яе узнаці маладу дзяўчынку
Фартух новы парколевы
Сітцева хусцінка

——— " ——— " ———

Записаў С. П. Сахараў 29 ліпеня 1939 г. ад Гертруды Сгладзеўскай, 40 год, у в. Савельнікі, Пастнакаў вол. Лудзенскага пав.

# Карагодная

## Мяцеліца

А на вуліцы мяцеліца мяцець
З пад мяцеліцы мой міленькі ідзець.
Раз, два, тры люлі, з пад мяцеліцы
мой міленькі ідзець.
За сабой ен каня ворана вядзець,
Залатым ключом паброзгіваець,
Раз, два, тры люлі, залатым ключом
паброзгіваець
А міленькі каня паіў
Залаты ключы ў ваду згубіў
Раз, два, тры люлі, залаты ключы
ў ваду згубіў
А хто мае ключы знайдзе
Той мяне маладую замуж вазьме,
Раз, два, тры люлі, той мяне ма-
ладую замуж вазьме

А на вуліце мяцеліца мяце
З-пад мяцеліцы старык сівы ідзе
Раз, два, тры люлі, з-пад мяцеліцы ста-
рык сівы ідзе
І ў руках залаты ключы нясе.
Прападзіце мае залаты ключы
Я за старага замуж ні пайду
Раз, два, тры люлі, я за старага за-
муж ні пайду

---

Запісаў б. вучань Дзьвінскае белар.
гімназіі А. Зонін ў в. Дубрышкі,
Пустынскай вол., ад старухі Пелагеі.
на калядных сьвятах 1929 г.

# На супрацьках сьпяваюць

Вечарушачкі вы прадзіце
Гэй, гэй вы прадзіце,
На мяне маладую ні глядзіце
Гэй, гэй, ні глядзіце,
Бо я малада заручона
Гэй, гэй, заручона,
Ні за лысага беса, за дзяціну, гэй, гэй
– Ды ці пусьціш дзяціна да мамця ў госьці, гэй
– А жонучна, любучна, ды ніз мочна, "
– Завядзіце дзяціну ў чыста поле "
Прывяжыце дзяціну да бярозы, гэй гэй
Палажыце дзяціне сена вязку, "
Ды пастаўце дзяціне вады ранку.
Тры тыдня дзяціну ні глядзелі, "
А на чацьвертым тыдзені паглядзелі,
Ды ляжыць сена вязка цалюсенька,
Ды стаіць вады ранка паўнюсенька
– Ды ці пусьціш дзяціна да мамця ў
госьці?
– А жонучна, любучна, хоць сёньня!
– Прывядзіце дзяціну да пакоя,
Ды пастаўце дзяціне сыра, масла
Гэй, гэй, сыра, масла "

— " —

Запісаў на калядных сьвятах 1929 г.
быля вучань Дзьвінскае белар. гімна-
зіі А. Іонін ць Ялава, Кустан-
скай вол.

## Плясовая песня

Весяла я, ня весяла сягоняшні дзень,
Толькі развясельненька нанешні час,
Хадзіла гаспадыня ў зялёным саду,
Шчыпала, ламала зялён вінаград,
Кідала, брасала к дружку на кравать.
— Ці ты спіш, дружочак,
Ці так ляжыш, слоўца ня кажыш,
Адказу не даеш.

По камешку рэчанька бяжыць, ня шуміць,
За ракою дзяўчына рэчы гаворыць:
Ня пой, ня пой салавей у зялёным саду,
Не задавай досады сэрдэчку майму.

Запісаў С. П. Сахараў 12 XI 1938 г. ад Уршулі Нейкборт (па бацьку — Белявускай), 74 г., у м. Рога Нейкборт родам з Лукішчына

## Шуточная

Юзефка, што ты замуж хадзіла,
Што ты на бодюсяку не глядзела;
— А ён так і не харошы,
А ён так і ня прыгожы,
У яго ногі крывыя, у яго вочы рудыя,
Наша мыла панскае, у яго твар цыганскі.
Мы тутэй мыла змылы, яго твару ня вымылі,
Прынясіце барану, пачэшым галаву,
Барану паламалі, галаву не расчэсалі,
Наша барана зялезная, але бязпалезная.

Запісаў С. П. Сахараў 12 лютага 1938 г. ад Агаты Невяроўскай, 66 г., прыст. Індра.

# Плясовая - Карагодная

Пры даліне калінка стаіць
На каліне салавейка сядзіць,
Горку ягоду калінушку клюець,
А малінаю закусываець,
Прыцізалі к салоўюшкі сакала,
Брали, брали яго ў клетачку,
За серэбряну рашоточку садзілі.
Уж ты пой, распявай салавей
Далучы мне удалага малайца,
Знаць маланька мінавалася гуляць,
Засталася я старому малада,
Ня пусціць стар на вуліцу гуляць,
Хоць і пусціць сам услед пойдзець,
Мяне молоду ругаіць і браніць.
Ты купі пларье шаўковае,
А другое - калёнкоравае,
Калёнкор беля мараецца,
Мой твар разгараецца;
Стаіць дзеўка ў гародзе з малайцом,
І стаяла разгаварывала
Засушылі чорны бровы малайца
Разарылі жэгуцце яго да канца

—— „ —— „ ——

Запісаў С. П. Сахараў 12 XI 1938.
ад Ўршуля Кейпбарт (па бацьку Беляў-
ская), 74 г., у м. Рыга

З вясновых песень

Узыйду, узыйду на гару, (по 2 разы)
Гляну, гляну пад гару.
Ці усе сады зялёны,
Ці усе сады разцьвілі?
Усе сады зялёны,
Усе сады разцьвілі,
Удару, удару ў ладонкі
Залатым пярсьцёнкам,
Ці ня ўчуіць родны татулька,
Ня ўчуў родны татулька,
а ўчуў сьвекарка
— Не пабівай ладонкамі, залатым пярсьцёнкам
— Ня ты расьціў ладонкі,
Ня ты купляў пярсьцёнкі,
Расьціў родны татулька ладонкі
І купляў пярсьцёнкі

———— " ———— " ————

Хадзіла Тота каля балота, то-то (прып.)
Насекла Тота тры вазы лазы,
Загарадзіла Тота тры гароды,
У адным гародзе чырвона рожа,
У другім гародзе зялёна мята,
У трэцім гародзе зялёна рута,
Хто прыгожы пільнуе рожы,
А хто багаты пільнуе мяты,
А хто круты пільнуе руты

———— " ————

Запісаў С. П. Сахараў 1 кастрычн. 1939 г.
у в. Шушкова, Шкавенскай вол., Лудзенскага пав., ад Вікторыі Дажчонак, 80 г.

## Звяснавыя песні

Васіль. Васілечак бўровенькі (садовенькі) твой цвяточак,
Ды дзе-ж цябе пасадзіць,
ці ў полі, ці ў гародзе,
ці ў татківым садочку,
ці ў мамкі пад ваконцам,
А хто-ж цябе паліваць будзе,
Мой татка старюсенькі,
А мамка стар эй таткі;
Была ў мяне жана,
Учора-звячора прыведзена,
Па ціхі Дунай ваду пашла,
Як пашла, так і ня прыйшла,
Ці яна там утанула,
Ці яна заблудзіла,
Ці яе ваўкі з'елі;
Каб яна утанула,
Ціхі Дунай ускалыхнуўся-б,
Каб яна заблудзіла,
Цёмны лясы зашумел-б,
Каб ваўкі яе з'елі,
Была-бы трава прыкачана,
Гарача кроў разлівана.

———,, ———

Запісаў С. П. Сахарэў 1 жніўня 1939 ад Вікторы Дамчонак, 80 год, у в Шушкова, Шкавенской вол., Лудзенскага пав

# Вяснавыя песьні

Ляцела дзераўца цераз наша сяльцо.
Ды з таго дзераўца ставілі царкоўку,
Ды ў тэй царкоўкі тры месяцы ясных,
Тры Зарыцы красных;
Ды пэршы-ж месяц маладзы Маджэтка
Ды другі месяц маладзы Янутка,
Ды трэцці месяц маладзы Юзэнка,
Ды пэршая Зарыца малада Ганачка
Ды друга Зарыца малада Сабинка;
Ды трэцця Зарыца малада Манечка
Маджэтка Ганачку любіць і хустачку купіць
Янутка Сабінку любіць і спадні́чку купіць
Юзэнка Манічку любіць і чаравічкі купіць

— " — " —

Над ракой вербянка стаяла,
Там дзяўчыненка ваду брала
Тую вербянку праклинала:
Бог дай, каб вербянка ссохла, зьвяла-б,
Пад табой верба вада горка,
А мне маладой жыць ня лоўка;
Каб я была перапелкай,
Куды ўздумала паляцела-б
Ці ў зялёны сад на вишанькі
Ці ў цемны бары на брусніцы

— " —

Запісаў С. П. Сахараў 3 ліпеня 1939 г.
ад Ганны Марчонак, 55 год, ч в. Ишкова,
Ишковенскай (б. Лёндскаронскай) вол. Лудзенск
пав.

# Вяселныя песьні

Ох ты сонца мае ясное,
Чаго рана за лес коціся,
Уся бяседухна расходзіцца.
Мая мамка дамоў ладзіцца,
А я млода прапускаць пайду,
У чыстым полі застаялася,
З роднай мамкай загукалася
На вішаньню заглядзелася.
Што вішаньня зялёнюсенька,
А я млода маладзюсенька

—— " ——

Ох ты вульха (альха) зялёная,
Ды чаму-ж ты не такая
Як у Пятроў дзень была;
Ты Марылька маладая
Ды чаму-ж ты ні такая
Як у мамкі была,
Як у садзе ружа цьвіла,
Прывядзіла ты дзевяць сыноў
А дзесяту дочь Ганулю

—— " ——

Запісаў С. П. Сахараў, 31 ліпеня 1939 г., ад Ганны Марчонак. 55 год, у в. Шушкова, Шкавенскай вол. Лудзенскага пав.

# Вяснавая

Сеяў маладзец васілечкі,
Пасеяўшы проч паехаў,
Ад'ехаўшы ён аглянуўся:
-Красачкі мае васілечкі,
А хто-ж вас будзе паліваць,
А хто-ж вас будзе даглядаць,
Мая матулька старэнькая,
Мая сястрычка маленькая,
Мая жонучка маладая,
Ды пашла яна ў крынічку
Па халадніценькую вадзічку,
Ды ці яна там утанула,
Ды ці яна там заблудзіла
Ды ці ёе там ваўкі з'елі
Каб яна там утанула
Была-б поўна крынічка вадзіцы,
Дн каб ёе там ваўкі з'елі,
Была-б травічка пакранана.

— . — . —

Запісаў вучань Дзьвінскае дзяржаўнае беларускае гімназіі А. Ёнін 5 студзеня 1929 г. у в. Юраны Пустынскай вол. Даўгаўпілскага пав. ад бабулі Чжаль

# Купальскія песьні

А на Яна ночка мала,
А я малада не даспала,
Усе арэшкі пашчаукала,
Я ядзерцы ў мед клала.
Шалупінкі ў палычкі,
Для матулькі ўсе ядзеркі,
Для сьвякроўкі шалупінкі,
Еж матулька спажывися.
А сьвякроўка задавися

———"———"———

Бадай той певень прапаў,
Што мяне рана разбудзіў,
Малая ночка, мала,
Яшчэ я маладая ні даспала,
Прыспары Божа ночы,
На мае чорныя вочы,
Тобы я выспала.
Каб маці ні пазнала,
Ці ў даму пры парозе,
Ці ў лесе пры дарозе
Заусёды маладоча знаю
Бо чорныя вочы маю
Бадай-бы певень знудзіў,
Што мяне рана ўзбудзіў,
Малая ночка, мала
Яшчэ я ні праспала

—"—"—

Запісаў вучань дзьвінскае дзярж. белар. гімназіі
А. Зенін 5 студзеня 1929 г. у в. Юргана, Пустынскае вол.
Заўзяты ... ад бабулі Чэкаль

# Купальская песьня.

Нізка, нізка сонца ходзіць,
За мой лясок не заходзіць,
Блізка, блізка татка едзець,
Ка мне ў госьці не заедзець,
Ці дарожкі ён не знаець,
Ці конікі не завернець,
Ці вароцікі не адчыніць.
— І дарожку я знаю,
І конікі завярну,
І вароцікі адчыню,
А як я прыеду ты усё тужышь,
Як ад'езджаю моцна плачышь,
Ды паедзем у чыста поля,
Разсяваці твае гора,
Каб яно не усходзіла,
А усходзіла-бы — не цьвіцела,
А цьвіцела-бы жоўтым цветам пустацве-
там,
Што-бы дзевачкі ня шчыпалі,
У вяночкі ня звівалі,
Твае гора ня узьвілічалі

— " —

Запісаў С. П. Сахараў 12 ліпеня 1938 г. ад Агаты Неварoўскай, 66 г., пражываючай часова пры ст. Індрыя (сама родам з в. Брэзьмаро, Прыдруйскай вол.).

# З купальскіх песень

Выйдзі, выйдзі гаспадынька,
Ночка мала купальная! (прыпеўка)
З белым сырам, з малым сынам,
Ні хадзі рабром, нясі піва вядром,
Ты хазяйка ніхавайся,
Сыра, масла пастарайся,
Ты хазяін ні лянісь,
Каля бочкі павярнісь,
Ночка мала купальная!

―――――― " ――――――

Пойдзім сястрыца пад яену зарніцу,
Ночка мала купальная!
Возьмім сястрыцу жоўтага пясочку
Пасеімце сястрыца свьвекарку пад ваконцам;
Пойдзім сястрыца пад яену зарніцу,
Возьмім сястрыца ярыцы, пшаніцы,
Пасеімце сястрыца у свьвекарка пад ваконцам
Ночка мала купальная!

―――――― " ――――――

Дзіва, дзіва за ракою,
Ночка мала купальная!
Па ў сем баку дзіўнейшага,
Качарга ябко зьнясла,
А памяло дзяцей вяло,
Ночка мала купальная!

―――――― " ――――――

Запісала матурыстка Дзьвінскае дзярж. белар. гімназіі Антаніна Лукашэвіч ад Адэлі Вайвод, 50 г., у в. Лоцп. Вайводаўскай (Букмуйжскай вол.), Рэзекненскага пав., 7 ліпня 1939 г.

# З купальскіх песень

Ну-ці дзеўкі на купальну,
Вам дзевачкі своя воля,
Купальня ні/я мне,
Калі волі нету,
Дзіця плачыць у калысцы,
А муж бурчыць на пасцелі

——— , ——— , ———

Сьвенты Яне, на купальню!
Сьвенты Божа, німа часу,
Сьвенты Яне што робіш?
Моцны Божа, ячмень сею,
Сьвенты Яне на што ячмень?
Моцны Божа, піва варыць.
Сьвенты Яне, на што піва?
Моцны Божа, сына жаніць
Сьвенты Яне, каго браць?
Моцны Божа, Магдаленку.

——— , ———

Запісаў матурыстка Дзвінскае дзярж. беларускае гімназіі Антоніна Лукашэвіч ад Адэлі Вайвод, 50 г. у в. Лоцы, Вайводаўскай (Бікшутскай) вол., Рэзекнескага пав. 7.VIII 1939 г.

## З купальскіх песень

(так сама спяваецца абыкам)

Ту-ру, ту-ру па дуброўкі
Ды там едзіць пан вялікі,
Пан вялікі, брыль шырокі.
– Ты вярніся, ты вярніся
Пан вялікі, брыль шырокі
Твая жана дочь мела
– Я для дочы ні вярнуся,
Я для дочы падарую,
Плат шаўковы, вянок пярловы

Ту-ру, ту-ру па дуброўкі
Ды там едзіць пан вялікі
Пан вялікі, брыль шырокі.
– Ты вярніся, ты вярніся
Пан вялікі, брыль шырокі
Твая жана сына мела
– Я для сына вярнуся
Куплю сынуканя вараногa, у зду залатую
І для сына падарую

Запісаў С. Й. Сахараў – 1 кніжня 1939 г.
ад Вікторыі Дамчонак, 80 г., у в. Шушкава, Шкавен. вол.

Садзем бабы на гару
Кулаком зямлю прабілі,
Сваіх дочак хвалілі, нявестачак цілі,
Нашы дочкі кужаль пралі, сьпявалі,
Кросны ткалі, скакалі,
А як нявестачкі – гультайкі
Кужаль пралі – драмалі,
а як кросны ткалі усе спалі.

Запісаў С. П. Сахараў – 29 ліпеня 1934 г. ад
Гертруды Слядзеўскай, 40 год, у в. Савелянкі,
Пасінскай вол., Лудзенскага пав.

# З купальскіх песень

Што на Яна, на Івана,
Праўвілася правва
Дзеўкі зелкі капалі,
Хоці капалі дя ня зналі
У матухны пыталі:
- Скажы, скажы матухна
Што ета за зельле
Траякае карэньне?
- Дзявоцкая красата
А мальцоў сухота.
Ссохлі, здохлі дзяцюкі
За гарою сядзючы
На дзевачак глядзючы,
Ідуць, ідуць дзевачкі,
Як красныя кветачкі,
Ідуць, ідуць дзяцюкі
Як рабыя парсюкі.

---

Запісаў С. П. Сахараў 29 ліпеня 1939 г., ад Гертруды Смедзеўскай, 40 год, у в. Савельнікі, Пасінскай вол., Лудзенскага павету

## З купальскіх песень

Весел, ня весел сёньня дзень,
Ходзюць, гуляюць па маім саду,
Крышуць, ламаюць зялен вінаград.
Выкрашу, выламлю вінаградзінку,
Пайду я к мамке на парадзінку:
-Парай, парай мамонька,
Як мне з мілым жыць?
-Раю, параю мая дзіцятка
Мілы, ня мілы, міленька зави,
Сьцялі пасцельку узносенька,
К сьценке плечками, к міламу вочкамі

— " — " —

Бруяла вада каля камяшка,
Колькі ні бруяла скалыхнулася,
Скалыхнуўшыся сама ў брод пайшла.
Гукала дзеўка з добрым молодцам,
Колькі ні гукаўшы - усьміхнулася,
Усьміхнуўшыся ў госьці клікала:
-Ты хадзі ка мне добры маладзец у госьці,
Ты лесам ідзі - дробным дожджыкам
Ты лугам ідзі - буйным ветрыкам,
Ты ў сад у мой - салавейкам,
На двор на мой - ясным сокалам,
У хатку, у маю - міленькім другам

— " — " —

Записаў С. П. Сахараў 1 жніўня 1939 г.
ад Вікторыі Дамчонак, 80 г., у в. Шуш-
кава, Шкавенскай вол. Лудзенскага пав.

## З купальскіх песень

Ох, ты вольха зялёна,
Чаго-ж ты ня такая,
Як у Пятроў дзень была?
Фрасанька малада, чаму ты ня такая,
Як у роднай мамкі была?
– Міхалачка, сэрца мае
Дай мне волю такую
Як у роднай мамкі была
– Фрасанка душа мая,
Выведзі дзевяць сыноў
А дзесятую – дочь Марысю.
– Міхалачка – сэрца мае
Паставў дзевяць дамоў,
А дзесяты вяночак цярем.
Усім сыночкам па дамочку,
А дочы Марысі вяночак цярем

———— " ———— " ————

Сама бела бяроза кудравая
Процу сонейка на ветрыку стаяла,
Там дзяўчынка з роднай мамкай размаўляла.
– Ня аддай, ня аддай мяне за старога,
Я старога з-дайна ня любіла
Я з старэнькім адну ночку начавала,
Як свіння у мярлозе праляжала,
Аддай, аддай мяне мамка за маладога,
Я з маладзенькім адну ночку начавала,
Як пашнка ў мядочку праляжала

———— " ———— " ————

Запісаў С. П. Сахараў 1 ліпеня 1939 г. ад
Вікторыі Дамчонак, 80 г., у в. Шункава
Шкавенекаго вол., Лудзенскага пав.

# Купальскія песьні

Сьвяты Яніка, што ты робіш?
Божа моцны, дзячу дзёрам.
Сьвяты Яніка, на што табе дзёрам?
Божа моцны, ячмень сеяць.
Сьвяты Яніка, на што табе ячмень?
Божа моцны, піва варыць.
Сьвяты Яніка, на што табе піва?
Божа моцны, сына жаніць
Сьвяты Яніка, которага?
Божа моцны, хоць Міколку
Сьвяты Яне, дзе-ж дзеўка?
Божа моцны, хоць Магдуся.

---

Скакаў гнойбяк па вуліцы
Зьбіраў дзевак на купаліцу
— А вам, дзеўкі, свая воля
Прыняўшы купальлі на ўсіх дому.
А маладзіцы німа волі:
Сьвёкар крычыць лежачы на пячы
А сьвякроўка ля пячы,
Гаршкі ставячы.
— А мой міл галоўку скрыць
Дзіця плача ў кубелі.

---

Запісаў беларус. вучыцель
Мікола Талерка, ў в. Азерцы
II Савенец, прыд. вол., ад
Ткалі Сароцька, восеньню
1927.

# 3 купальскіх песні

Святы Яне, што ты робіш?
Божа моцін, ячмень рашчу.
Святы Яне, на што ячмень?
Божа моцін, піва варыць.
Святы Яне, на што піва?
Божа моцін, сыноў жаніць,
Дачок замуж выдаваць.

---

Скачыць чыжык па вуліцы,
Заве дзевак на купальле
Ну-ця, дзеўкі, ў купальле,
Ну-ця, дзеўкі, ў зялёну,
А вам, дзеўкі, свая воля,
А кабетам x) волі нету,
Дзеці плачуць у калыбелі,
А муж ляжыць у пасцелі,
А дзіця [illegible],
Я мужа кіну [illegible]
А сама малада пайду
у купальле.

---

Перад Янам ночка мала
Я малада ня даспала
Усе купальле я збірала,
А сабраўшы па цвяточку
раздавала па [illegible],
Таго [illegible] я збірала
Я збірала ў [illegible]

---

Запісала Марыля Барысёнак,
ад сваёй маці, у в. Баршчэўі,
Прыз. вол. у восені 1927.

---

x) кабетамі = жанчынамі

# З купальскіх песень

На Яна ночка мала,
Я маладая не даспала,
Усю ночку на купалі на
зялёнай.
Скачыце гусянькі на вуліцу,
Прасіце дзевак на купальле
на зялёнаю.
— Вам, дзеванькі, свая воля,
Маладзіцам волі няту:
Дзіця плачыць у калысцы,
Свёкар вурчыць у запечку,
А свякроўка праць печы,
А мой міль на пасьцелі,
А з свёкра не баюся,
А свякроўку пачарую
А ў шлюга [illegible]

———— . ————

Белая бяроза кармістая (2 раз.)
Ліхая свякроўка няравістая
Выйдзі, выйдзі, гаспадынька
з малымі сынамі.
З малымі сынамі, з белымі
сырамі

———— ————

Запісала вучаніца Кузьмі-
наўскай бел. школы Аўдзей
Сарзыка ад сваёй маці,
у в. Аўцюкі, [illegible] вол.
у восені 1927.

# 3 вясельных песні

На яблыньцы цвяточкаў многа,
Яблычка ні воднага;
У дзеванькі радні многа,
Роднага ні воднага;
За новай мятліцай
Стаяла вярбачка з раніцай
Хто гэтаю вярбачку зломіць,
Той і раніцу пойміць;
Там дзеванька хадзіла
Вярбачку зламіла і раніц сабрала
Расой умывалася,
Касой уціралася
Да шлюбу прыбіралася
— Я ж у хату не пайду
На дзіцятко паглядзець
Як яна убрана, як яна пагадана?
— Яна убрана як паненачка
А пагадана як сірочанька

— " —

Сядзіць зайка пад межачкай
Вочкі трэць
За што, про што маладая дзеванька
Міма едзіць і міма б'ецца;
Ці я табе сьцежанькі-дарожанькі патаптала
Ці я твае вазаночкі стрыжала?
— Патаптала сьцежанькі, дарожанькі шыра ваўкі
Патушылі твайх коні галубцы
Ааніўдзілі маладую дзеваньку харошую маладую
Сабе хацелі, да не ўзялі.

Запісана вучаніцай Казьмінскай бел. тэхнікума ад сваёй маці ч. в. Агрыпіны Адэлі Сарачка, 1 прод. вол. Свеж... 1927

## З купальскіх песень

Хадзіў чыжык па вуліцы,
Збіраў дзевак на купальну:
Пойдзем дзеўкі на купальну.
Вам дзеванькі своя воля,
Маладзіцам-гаротніцам волі няма-
Дзіця плачыць у калысцы,
Мужык варчыць на пасцелі.
А свекарка за сталом сідзючы,
А свекарка хату топячы
А залоўка хату мяцючы,
а дзеверка па сянем хадзючы,
цялятікі равуць, ня поены,
а кароўкі ня доены.
Ды я маладая прыбяруся
Я свёкаркі пакаруся,
а свякроўкі пакланюся,
а залоўкі косы уплячу,
Я дзіцятку прыкалышу,
Я цялятак пананапаю,
Я каровак падаю,
і мілага перапрашу,
Сама пайду на купальну

— " — " —

Запісала матурыстка Дзьвінскай белар гімназіі Апрасіння Хруцкая, у летку 1930 г., ад Жанчака Усціна Іўаніньчка — вай у в. Беляі, Ісярнскай вол. Лудзен пав.

З купальских песня.

Пойдзем-це сяструца
Пад ясну Зарыцу
Ночка мала купальная! (прыг)
Возьмем-це сяструца
Ярыцу, пшаніцу
Ночка мала купальная! (прыг)
Пасеем-це сяструца
На таткіным гародзе (прыг)
Ярыца ня усходзіць,
Пшаніца ня родзіць (прыг)
Мне ў татки ня быць.
Пойдзем-це сяструца
Пад ясну Зарыцу (прыг)
Возьмем-це сяструца
Жоўтага пясочку (прыг)
Пасеем-це сяструца
У сьвякровым садочку (прыг)
Пшаніца уродзіць,
пясочак усходзіць (прыг)
Мне у сьвекарки быць
Па садочку хадзіць!
Ночка мала Купальная!

———"———"———

Запісала вучаніца Дзьвінск. белар гімназіі Апрасіньня Хруцкая у лецку 1930 г. ад Жаньчыно Усьціна Пронін-кавай у в. Беляі, Іструнскай вол. Лудзен пав.

З купальскіх песень.
(перад Яновым днём)

У поле калыска вісіцьвяна нізка.
У тэй калясцы дзіцё ляжыць,
Тую дзіцяцю дзеўка зыбала (калыхала),
Тую дзіцяцю праклінала
Багдай тэя калыска на зямлю пала-б,
А гэта дзіцятка скрозь зямлю прапала-б.
А ўчу[?] парэнь на каню сідзіць.
— За што, дзеўка, дзіцё праклінаеш,
Ня чым ты дзіцяцю праклінаешь
Лучше табе долю даць
Парню маладога і каня вараного.

—— „ —— „ ——

Каля лесу, каля цёмнага,
Прылягала там дарожэнька шырокая,
На тэй дарожаньцы бяжыць конік воранюсенькі,
На тым коніку сядзіць малойчык маладзюсенькі.
Бяжыць конік развягаецца,
Сядзіць малойчык шатаецца,
Яго мамка пераймаець, у яго пытаець
— Ох, ты сынку мой, сынок,
На што так кваласься,
Што на коніку шатаешся
— Ох ты мацьмая, матулька
Ні сам я кваюся
Упаў мяне татарскіх
Трох ножыкам варускім
А чацьвертай — шабляй вайстрай
А пятой — Купяй прастай.

—— „ —— „ ——

Запісаў с. п. Сахарау — 1 жніўня 1939 г. ад Вік-торыі Дамчонак, 80 г., 76 Цушкова, шкавен-скай вол., Лудзенскага пав.

# З купальскіх песень

А ў калодзе поўна вадзіцы (па 2 разы)
Мяне свекар за вадой шлець,
А я свекра ні слухала,
За вадою ні хадзіла
З дубовым вядзеркам, з калінавым карамыслам
З шоўковым пачопкам;
Мяне свекар сынам страшыць.
— А мне твой сын ні то, ні сё
Як венік памяцёны,
Як атопак панашоны,
Як ранняя расавіца,
Як позняя дажджавіца

———— " ———— " ————

Маладая маладзіца (па 2 разы)
Стада гусей прыганяла:
— Ох вы гусі, гусі мае шэрыя
Прывыкайце к майму полю,
К майму полю далекаму
К майму ніу'ю шырокаму,
а як я молада прывыкала
Ды к чужой старонкі,
Ды к свекру і к свякроўкі
Ды к маладому мужу

———— " ———— " ————

Піва п'яна, піва п'яна, гарэлачка горка
Распушчонька раздуронька Хвядарава жонка,
Яна п'єць, прапівацць, дома ні бывацць
Ды хто-ж у цябе насьценка дома дагледаюць
— Есць у мяне сад, сад, вішневыя кветкі
Даглядаюць мяне дома малыя дзеткі

———— " ———— " ————

Запісаў С. И. Сахараў 1 жніўня 1939 г. ад Вікторыі Дашонак, 80 г., у в. Шушкова, Іскавенскай вол., Лудзенскага пав.

# З жніўных песень

Ой за гарою, за крутою
Ой расце жыта з лебядою,
ой расце жыта з лебядою,
А пшаніца з асакою
Ой, там дзяўчына
Жыта жала,
У правой руцэ
Серп дзяржала
У правой руцэ
Серп дзяржала,
А левою набірала.
Там у даліне
Казак косіць
А дзяўчына абед носіць.
- Пастой, дзяўчына,
Пацалую,
Срэбрам-златом
Надарую!
- Ой, не хачу цябе цалаваць,
Ой, не хачу твайго срэбра-злата браць.

— " —

Запісаў С. П. Сахараў 4 жніўня 1939 г. ад Марфы Зянькевой, 28 год, у в. Старая Слабада, Лудзенскага пав.

# З жніўных песень

У нас сення, у нас сення
Вайна была,
Усе поле, усе поле
Зважвалі
У снапочкі, у снапочкі
Павязалі,
У бабачкі, у бабачкі
Пасастаўлялі,
У копачкі, у копачкі
Пашчыталі

---

Ідзець стучыць, грыміць пара рабочая
Ідуць бягуць з сярпочкамі і з косамі,
Дзе ідуць і усе пяюць дзяўчаначкі,
Цвяточачкі маленькія
Якія-ж вы зялёненькія
Сення вы адзін аднаго калышыце
Назаўтра ранюканька у пракосах ляжыце

---

Запісаў беларускі вучыцель Мікола Гмырко у в. Азерцы (Крыдубічына)
у летку 1927.

# Жніўныя песьні

Ішоў раёк дарожкай шырокай,
Сюды раёк у мой дварок,
Мае дваркі мяцёныя,
Мае сталы засланыя
Кілішачкі залатыя
Напіточкі мёд-віно
Выйдзі паня ў аксаміце,
І прымі вянок у золаце

Запісаў С. П. Сахарау 28. VIII. 1937 г.
ад Высоцкай Еўкі, 56 г., у в. Балтыцы
(зараз - Рубені), Краслаўскай вол.

— " —

Што мувіла ядраное жыта
У полі стаючы?
Мувіла ядраное жыта
Не магу ў полі стаяці я
Каласком махаці,
Ды магу ў полі капамі
У гумне стагамі.
Што мувіла наша гаспадынька
Па двару хадзючы,
Ды мувіла, што не магу
Па двару хадзіці, ключыкі насіці,
Толькі магу за сталом сядзеці
Мёд-віно піці і з мілым гаварыць

— " —

Запісаў С. П. Сахарау 28. VIII. 1937 г.
ад Аполоніі Шляпінай, 48 год,
у в. Крывіна, Краслаўскай вол.

# Жніўная

Ішоў раёк дарожкаю,
Дарожкаю шырокаю,
Сюды раёк, сюды раёк
У наш дварок
Нашы двары мяцёныя,
Нашы сады саджоныя,
Нашы сталы цясовыя,
Нашы абрусы бялёвыя,
Нашы хлявы пшанічныя
Нашы страўкі сахарныя
напіткі салодкія

— " —

Віліся пчолачкі,
Віліся каля лозачкі;
павол вы вейцеся,
Паволі садзіцеся
Не абламіце сучайкоў,
не абтрасіце лісцікаў.
Віліся хлопчыкі,
Віліся малойчыкі
Каля маладой Мальвінкі
паволі вы хлопчыкі,
Паволі вы малойчыкі,
Паволі вы вейцеся,
павол вы садзіцеся,
Не абламіце золата
Не абтрасіце серабра.

— " —

Запісаў С. П. Сахараў 12. VII 1938 г. ад Агаты Невяроўскай, 66 г., пры ст. Індра

# 3. Жнiўнiск песнь

Хвала Табе, Божа,
Што мы жыта дажалi,
Да ў снапы павязалi,
Да ў полi ўсе капамi,
Да па гумне ўсе стадамi

———— " ————

У нас сення дажын, дажын
А Мiшку – ражон, ражон;
У нас ярпочкi заланяя,
А ў Мiшкi – гнiлыя,
Нашы жнейкi маладыя,
А ў яго старыя

———— " ————

У нас сення дажыначкi,
Пранiсьлi гарэлачкi,
Чатыры бутэлачкi,
Дзе гэдзе тая гарэлiца,
Гдзе стаяла бутэлiца,
У каморы пад лавiцай
Зарасла мураўiцай

———— " ————

Мне жыта рэдзiнька
Балiць мая сярэдзiнька
не з кiм стацi жыта жацi
Стаць са старым – загарусiцца,
Стаць з малым – загуляцiца,
Стаць з маладзцом – загакацiцца

———— " ————

Запiсала лацыгасiка Дзвiнскае дзярж. бeлар. гiмназii Антонiна Лукашэвiч у в. Муравiнка, Букiшдзкскай вол. Рэзекнескага пав. 9 жнiўня 1939 г. ад Гелены Ламашонак, 70 г.

# З жніўных песень

Рада, рада шэра перапёлка,
Што лета дажджала,
Радзей таво наша гаспадынька
Што жыта дажала,
Гаспадыня весяла, наварыла кісялю
Жнейкі гатоў,
Гаспадар ласкаў, увесь кісель злыскаў
Жнейкі даму.

— " —

Мае жыта радзінька,
Бальцы мая сярэдзінька,
Мая мамка дагадліва,
Д ён вылтакіла [redacted]дзіньку,
Папарыла сярэдзіньку.
Бярэдзінька ня шулела
Сярэдзінька ня хварэла.

— " —

Рада, рада шэра перапелка, што лета дажджала
Па полю літала, ягадкі клявала
Рада, рада наша гаспадынька, што жыта дажала,
Па полю хадзіла, снапкі састаўляла,
Снапкі састаўляла, копкі лічыла.

— " — " —

Рада, рада шэра перапелка,
Што лета дажджала,
Радзей таго наша гаспадынька
Што жыта дажала;
Буду па двару хадзіць, ключыкі насаць
Буду цяпер служакі будзіць!
-Уставайце служкі, вы мае дачушкі.
Есць каму парадкі вадзіць,
А некаму работкі рабіць

— " —

Запісала матурыстка дзьвінскай дзярж. белар. гімназіі Антаніна Лукашэвіч ад Гелены Ліпятонак, 70 г., у в. Муравянка, Букмуйжскай вол. Рэзэкненскага пав., 9. VIII. 1939 г.

# Жніўная песні

Маладая маладзіца
За бором жыта жала,
Яна жала ні гуляла,
Дзяцю маму калыхала,
Прыбеглі к ей тры ваўкі,
Да тры шэрыя,
Цалавалі, мілавалі,
На тры часткі разарвалі,
Каму ручка, каму ножка
Каму буйная галовушка

———— " ————

У нас сягоння дажон, дажон,
Ліхадзею ражон, ражон,
А ў нас сягоння дажыначкі,
Гаспадару пажытачкі,
Наша жыта ядро, ядро,
А ліхадзею кіла з вядро

———— " ————

Запісаў С. П. Сахараў 31 ліпеня 1939 г.
ад Ганны Марчонак, 55 г., ч в Шушкова
Шкавенскай (г. Ляндскорганскай) вол., Лудзенск пав

Сама пайду дарогаю,
А голас пушчу дубровою,
Няхай голас галасуіць,
Няхай мая свякроў чуіць
І вячэру гатуіць,
Калі ж яна не згатуіць,
Прыйду дамоў, забразгаю качаргою
Апынецця мая свякроў за гарой

———— " ————

Запісаў С. П. Сахараў 1 жніўня 1939 г.
ад Вікторыі Дамчонак, 80 г., ч в Шушкова,
Шкавенскай вол. Лудзенск пав

## Жніўная песьні

Ды ужо на дварэ зьмяркаецца,
Сямейка дамоў зьбіраецца
На цёплую вячэру
на мяккую пасьцельню;
Ложкі, міскі пад лавіцчэй,
Зарослі мураўішчэй

—,, —,, —

Зялён наш бор, над усім зелянейшы
Багат наш пан, над усім багацейшы
Ды ён сам у золаце, а жана у серабры
А дзіцяго яго у атласе

—,, —

## Ярынная

Звонкая дзерауцца калінка,
Уверх ляцела, зьвінела,
Уніз ападала, стучала,
пакорная дзіцянька нявеска
ня відзеўшы сьвекрусьпазнала
церазь мір ручанку падала,
Пра мілага здароўе спытала

—,, —

Гаварыў зялёны лен
Пры дарозе стоя
Калі мяне ня вырвіце
Я сам заваліся, па дарожке раесцялюся
Гаварыла нявестка свае роднай матушке
Калі мяне ня выдаеце
Я сама замуж пайду,
Што за тын, за варота,
За суседняга сына,
Ды ён будзе купчаваці,
а я за ім панаваці
Ён будзе мёд-віно піці
А я буду сьлёзы ліці

Запісаў С. П. Сахараў 1 жніўня 1939 г., ад Вікторыі Дамінюк, 80 г., у в. Шушкова, Лудзенвенскай вол. Ожага пав.

# Жніўныя песьні

Жыта жала сьлічна панна
У парваным вяночку,
Дый праехаў дваранін - мяшчанін
На вараным канёчку.
- Дай бог помоч, сьлічно панна
У парваным вяночку.
- Да дзякую дваранін - мяшчанін
На вараным конечку.
- Кідай панна залаты серпок
На жытні снапок,
Сядай панна на залатое сядло
На вараного коніка,
Дый паедзем лужком, беражком
Каліновым мастом,
Там мы найдзем дзерацца дупелева
Залатыя месца.
Пастаяла свае рэзвыя ножкі
У каліновым мосьце,
Пагладзела свае ясны вочкі
У чужую старонку,
Ждала, ждала свайе мамкі
У каліновым мосьце,
Ні дажждала свайе роднай мамкі, ні татки,
Дай дажждала ліхога сьвёкра, лихую сьвякроўку.
Дый хадзіла каралева жана на чыстому полю,
Дый хадзіла, дай прасіла яна бога
Каб на вайне караля забілі.
А я выйшла-б за другога, дай за маладога,
Ен умеіць і пісаць, і читаць, і ў скрыпачку іграць,
А я умею і скакаць, і плясаць, і ў ладанькі
плешчыць!

---

Запісаў беларускі вучыцель Мікола Шалерко
ад Марыны Азерской, 60 год, восеньню 1927,
ч в. Азерцы. Віцебскай вол.

# Жнiўная песьня

Ды я пайду малада на поле
 ай мой рана на поле (крык)
Ды пушчу я галасок да дому,
 ай мой рана да дому!
А хто-ж мой галасок пераймець
 ай мой рана пераймець!
Ды пераймець галасок мой татухна
 ай мой рана татухна
Ды вось мае дзяцянка гуляець, ай мой…
Шырокiя пастацькi ганяець, ай мой
А частыя снапочкi выстаўляець, ай мой
 Ды я пайду малада на поле, ай мой
 Ды пушчу я галасок па волi, ай мой
 А хто-ж мой галасок пераймець, ай мой
 Ды пераняў галасок свекарка, ай мой
 Ды вось мае зявала зяваець!
 У вузкiя пастацьк(i) ганяець
 У рэдкiя снапочкi выстаўляець
  ай мой рана выстаўляець!

— " — " ————

Запiсала матурыстка Дзьвiнскае белар. гiмназii Апрасiньня Хрупкая у летку 1930 г., ад жанчыны Усьцiньнi Грынiкавай у в. Белi, Iстрэнскай вол., Лудзенскага пав.

# Жніўныя песьні

Жніце, жніце, мае мілыя жнейкі,
Прынясу гарэлкі чатыры бутэлькі
Сама паскаштую і гасьцей пачастую.
Жніце, жніце, мае мілы птушкі
Навару вам кашкі.
Жніце, жніце, мае мілы жнейкі
Навару вам бульбы.

---

Дый па бару па верасу (2 разы)
Там хадзіла шынкарачка
Пагубіла залаты ключы!
Маманька ідзець, ключоў нету
Дый па бару, па верасу
Там хадзіла шынкарачка,
Пагубіла залаты ключы,
Там татка ідзець, ключоў нету
Дый па бару, па верасу
Там хадзіла шынкарачка
Пагубіла залаты ключы,
Там брацітка ідзець, ключоў нету
Дый па бару, па верасу
Там хадзіла шынкарачка
Пагубіла залаты ключы
Там міленькі ідзець,
ключы нясець.

---

Запісаў бел. вучнем
Міколам Таленкам, ў в. Азерцы
II Совенец, Прыд. вол., ад
Тэклі Сардыко, 42 годы
у восень 1927.

# Жніўныя песьні

На бару жыта жала,
Прыйшлі весьці нерадасныя
Сьвякроў з тачну зьвалілася,
На страківу прабілася.
Страківа мая жыгливая
А сьвякроў мая сіклівая;
А страківа мая зялёная,
А сьвякроў мая шалёная.

— " —

Слава Богу дажалася
А суседзі асталися,
У нас женейкі маладыя
І сярпочкі залатыя,
А у іх женейкі старыя
І сярпы у іх ламаныя

— " —

Ты, ластаўка белакрылка,
Ня вей гнязда пры дарозе,
Арол лячуць, гнязде зрыцці
Малых дзетак разгоніцці
Што і па мхам, і по балотам
І па чыстаму полю, і па зялёнаму лугу.
Ты, Гертруда маладая
Ня вей венька у мамуння,
Сваты едуць, вянок сарвуць,
Цябе маладу з сабой вазьмуць

— " —

Запісаў С. П. Сахараў ад Гертруды Сьмядзецкай, 29 ліпеня 1939 г., у в. Саўляні, Пасінскай воласці.
Г. Сьмядзецкай 40 год і займаецца шыцьцем

# Жніўныя песні

Шырокая дарожухна,
Ці ня дожджь цябе змачаў,
А ці ранняя раса?
Ня дожджь мяне змачыў
І ня ранняя раса,
А змачыла мяне горкая сіраціна
Да касцёлу рана хадзючы
Шчыра богу малючы,
Прасіла яна ў божанькі:
Чзяў татку, чзяў мамку,
Вазьмі мяне сіраціначку.
– Ня чым-жа цябе браць,
Лепш табе долечку даць –
Каня вараного і малайца маладога

—"—

Зяленае арэхаў'е
цераз тын перавісла,
З-пад таго арэхаў'я
сівы коні выбегаліь,
там Мадэстка з вайны едзець,
Яго мамка перайм(а)ць
І у яго пытаць:
Ці ня адзін з вайны едзешь?
– Я ні адзін з вайны еду,
Сівы коні пада мной
І ўся дружына за мной,
Уся дружына як мак цвіціць,
А я сам як жар гару,
А яна як мачанка

—"—

Запісаў С. П. Сахараў 3 ліпеня 1939 г.
ад Ганны Марчонак, 55 год, у в. Шушкова
Шкавенскай (б. Лядскаронскай) вол. Лудзен пав.

# Жніўныя песьні

Выдзі, выдзі цёмная туча з-пад цёмнага лесу
Ды ня выйшла цёмная туча з-пад цёмнага лесу,
Ды выслала дробнага дожджыку і бутнага ветру
Выдзі, выдзі наша гаспадынька, сама трэцця на ніўку
Ды ня выйшла наша гаспадынька, сама трэцця на ніўку
Ды выслала трох сынкоў сакалкоў, дачок перапёлак,
– Жніце, жніце, тры сынкі сакалкі, дочкі перапёлкі,
Я выкачу дзевяць бочак піва, дзесятую мёду,
Жніце, жніце, мае жнейкі,
Прынясу я вам гарэлкі.

---

Ішоў раёк, ішоў раёк дарогаю шырокаю
– Сюды раёк, сюды раёк у наш дварок
Наш двор мецены, наш стол засланы
Наш госці сазваныя, наш чаркі залатыя
Усе мёдам наліты.

---

Ды хадзіла каралёва жана на пытаньню поля,
Ды прасіла каралева жана ды Гаспада-бога
– Ды, дай Божа, каб майго каралю на вайне забіці,
Тады я буду і плакаці і ў далонькі плешчаці

---

Што мувіла ядроная жыта на ніўцы стоячы:
Ні магу я на ніўцы стаяці каласкамі махаці –
Толькі магу на полі копамі, у гумне стагамі.

---

Запісала Марыля Барысёнак ад сваёй маці, ў в. Барцішкі, прыд. Вол. 1927.

# Жніўныя песьні

Рада, рада ніва перапёлка,
Што лета дажджала,
Рада, рада наша гаспадынька,
Што жыта дажала.
Да выпала трох сынкоў сакалкоў
Дочак перапёлак.
- Жывіце, жывіце, сынкі сакалкі,
дочкі перапёлкі;
Поўна, поўна чара золатаў,
віна паліта
Ды так паліта, што ня ска-
лыхнецца,
Ды так наліта, што ні праліецца.
Поўна, поўна ў нашага гаспадара
гумно навезена
Ды так поўна, што ні канём аб'ехаць,
А ні паглядзець,
Толькі можна сокалам абляцець,
Добра паглядзець.

---

Хадзіла каралева жонка (па 2 разы)
Хадзіла па жытаму полю
Ды прасіла каралева жонка
Ды прасіла Госпада бога!
- Каб майго караля на вайне
забілі,
А сама маладая, я-б выйшла
за другога
За другога, ды за маладога,
Ён умеіць і жытаць і пісаць
І на скрыпачцы іграць
А я ўмею і скакаць і пяяць
У ў далонькі пляскаці

---

Запісала вучаніца Журмілаўскай
бел. школы Адэля Сапрыка, ад
сваёй маці, ў в. Аўгусці прад вой.
1927 г.

З жніўных песень

Дзеванька сротанька
Пад борам жыта жала
На сонейка пачмадала.
-Сонейка мае яснае,
Чаго рана ўсходзіш,
Чаго позна заходзіш?
-Дзеванька сротанька,
Я на ніцца цябе кідаю
І на ніццо знаходжу,
Там табе нада стаці,
Шчыру праўду сказаці,
Касьцеля паабмакана
Каберцы пазаслана
Там нада вам стаці
Шчыру праўду сказаці,
А звяжыць вам каендз ручанькі
Чорнаю тульою,
Чорнаю, цьвяцістаю
На век вячыстаю.

— " —

Запісаў С. П. Сахараў 28 жніўня
1937 г. у в. Крываня, Краснаўскай
вол., ад Апольлі Шляпіной,
48 г.

# З жніўных песень

## Калі канчаюць жаць

Па бару, па верасу (па 2 разы)
Там хадзіла шчынкарачка
Пагубіла залатыя ключы
— Ідзі мамка, ідзі мамка
Знайдзі ключы!
Ідзець мамка, ідзець мамка
Ключоў нет.
Па бару, па верасу
Там хадзіла шчынкарачка
Пагубіла залатыя ключы.
— Ідзі татка, ідзі татка
Знайдзі ключы!
Ідзець татка, ключоў нет
Па бару, па верасу
Там хадзіла шчынкарачка
Пагубіла залатыя ключы.
— Ідзі брацітка, ідзі брацітка.
Знайдзі ключы!
Ідзець брацітка, ключоў нет
Па бару, па верасу
Там хадзіла шчынкарачка.
Пагубіла залатыя ключы
— Ідзі сястрыца, ідзі сястрыца
Знайдзі ключы!
Ідзець сястрыца, ключоў нет.
Па бару, па верасу
Там хадзіла шчынкарачка
Пагубіла залатыя ключы.
— Ідзі мілы ключы знайдзі
Ідзець мілы, ключы нясець

— " —

Запісаў С. П. Сахараў 28 [illegible] 1937 г.
у в. Ковалі, Браслаўскай вол. ад Апалоніі
Шлячкінай, 48 г.

Другі варыянт гэтай памяранай песні запісан мною у в. Скерыканы, той-жа воласці
(гл. ст. 84 т. I).

## Ярынная песьня

Было ў дзеда тры дачушкі,
То дзеду бог даў (прыпеўка)
Адна выйшла за гаршкана,
Другая выйшла за хлебара,
Трэцьця выйшла за дудара
Гаршкан едзе, воз гаршкоў вязе,
Хлебар едзе, воз хлеба вязе.
Дудар едзе, воз дудак вязе
То дзеду бог даў

———— „ ————

На рэчы друженьку, на рэчы
Каб села-б друженьку семь скул на плечы;
На гаворку, друженьку, на гаворку,
Каб села-б друженьку семь скул на галоўку,
На мову, друженьку, на мову
Каб села семь скул на брову.
За зык, друженьку, за зык
Каб села семь скул на язык.

———— „ ————

Запісаў беларускі вучыцель Мікола Талерко ад Марты Азерскай, 60 г., у весцы Азерцы (Крывадруд-шчына) у летку 1927 г.

# Беларускія прыказкі

1. Плач, галасі, рады не дасі.
2. Своя хатка, як родная матка
3. Німа такіх крамачак, кабы прадавалі мамачак.
4. Німа лепшага дружка, як родна матка.
5. Хто тутын курыць, таго ў пекла туруць, а хто нюхаець, той ззаду трухаець
6. Хоць чорная мама, абы поўная лапа
7. Не бяры нічога, ня бойся нікога

---

Як задумаў верабей з сініцай жаніцца,
Саладкіх рэчаў пашкадаваць і віна напіцца,
Скочыў нічэгла да места з конямі варанымі,
Накупіў чаго трэба грашыма залатымі,
Накупіў, накупіў і назад вярнуўся.
Ты шэры верабей да шлюбу гатуйся,
А варона-стара жона пірагі мясіла,
А сарока-белабока у печку садзіла

---

Запісаў у лецку 1938 г. ад Ганны Гвозд у ф. Прапарышчакава гара, Ілукстскага пав.

С. Сахараў

## Восеньскія песьні

У балоці на калодзі мядзьведзь рыкаіць,
Дзевак пужаіць
- Рыкай, ня рыкай я ужо ні баюся нічога
Толькі баюся аднаго бога
Да мужа маладога, кнута ралянога

— " — " —

Выйду я, выйду малада ў поле,
Да пушчу я галасок да дому,
Да хто-же мой галасок пачуіць.
Пачуіць мой галасок татулька
- Гые-ж там дзіця голасна сьпіваіць.
Часта жаленькай макаіць,
Высока конначкі ставіць?

— " —

Села Ганачка села малада піць, гуляць,
Паставіла сваіх брацінкаў вартаваць.
- Вы вартуйце мае брацікі родная,
Каб ня ўзыйшоў-бы ясен месяц зарою,
Каб ня ўз'ехаў малады Антолька з сястрою;
Ні ўвартавалі мае брацікі родная
Вы ўзыйшоў ясен месяц зарою,
Вы ўз'ехаў малады Антолька з сястрою,
Вы ўзяў-жа сваю Ганачку з сабою

— " —

Запісала Марыля Барысёнак
ад сваіх родных у в. Бартулі,
Крыгорускай вол., у восені 1927.

## Талочныя песьні

Талачу, талачу, талакі ні ўнясць,
Ні дадуць гарэлкі, ня буду пяяць,
Татулька, татулька, я ў цібе адна,
Налій мне гарэлкі, я вып'ю да дна.

—— " ——

Бела бяроза караністая,
Наша сьвякроўка наравістая.
Белаю бярозу сякуць, рубаюць,
Нашаю сьвякроўку лаюць, ругаюць.

—— " ——

Ішоў я спаўначы з карчмы,
Знайшоў я салаўя ў карчы,
Салавей нічабечыць, усю праўду кажоць,
Дзе мая Жанухна ночку начуіць,
Начуіць Жанухна сама з сабою,
Белыя ручкі пад галавою

—— " ——

У лузе салавей калінку клюець,
А ў доме сьвякроўка нявестку журыць,
Ні пятух ні пяець, гусак ні крычыць,
Паслала нявестку ў Дунай па ваду:
- Чэрпай мілая поўныя суды!
- Я коні напаю, і ваду прынясу!
На табе, матулька, з Дуная вады,
Памыйся, напійся з поўнага вядра.
- Я цібе нявестка па ваду слала,
Я цібе нявестка са свету збаўляла

Запісала Марыя Барысенак
ад сваіх радных у вёскі Бартулі
[illegible]скай вол., у восені 1927 г.

## Родныя песьні

### Восеньская

Ды на полі ліпа, рана рана
Сонейка іграець,
Малады маладзец коніка сядлаець,
А старшы брацітка яго намаўляець:
- Выбірай, брацітка, на ніўцы,
А ня выбірай брацітка на рэчку,
На рэчку дзевачкі хвасьлівы
А на ніўцы дзевачкі працаўлівы.

Запісаў С. Н. Сахараў ад Агнесы Габвіт
70 г., у в. Крываны, Краслаўскай вол.,
28 VIII 1937.

---

Сею рэдзьку, сею, паліваю.
Расьці рэдзька вялікая,
На зіму схаваю.
Я ня буду рэдзьку есьці,
Людзі кажуць, горка.
Я ня буду жаніцца,
Будзе біць жонка.
Біла жонка мужыка,
Рукі закасаўшы
А ён яе перапрасеў
І шапачку зьняўшы
- Дзякую, мая міла,
Ды ты ж мяне мала біла.

---

Запісаў С. Н. Сахараў 12 XI 1938 г.
ад Уршулі Нейжборт (па бацьку - Бялуйская)
74 г., у м. Рыга. Нейжборт родам з Ілукшчыны.

# Загадкі

1. Цераз мора катоў хвост. (Вядро і пачопка цераз вядро)
2. Паміж лісц сьвіньня вісіць (дзьверы павешаныя)
3. Чатыры брата назад барадатых. (ногі ў каня)
4. Маць-таўстуха, дачка-красуха, а сын Лявон абярнуўся да вон. (печ, у печы ва гонь, а з вагня-дым)
5. Слабка стоя, туга вісіць, сам касматы і канец лысы. (Гарэх)
6. Стаіць Давыд на кол крабіт, яму даюць, яму і кланяюцца. (Ручныя жорны малоць)
7. Стаіць баба на віру, хто прыдзець, то ў дзіру. (Студня-калодзець)

Запісаў С. П. Сахараў 22 чэрвеня 1938 г. ад Гелены Смачкі ў М. Краславы. Дзьвінскага пав.

Хрэзьбіныя, дзіцячыя, вясельныя, хаўтурныя, рочныя песьні.

## Хрэсьбінныя і дзіцячыя песьні

### Бабке

Наша бабка ня дужа, ня дужа
Пастаночкі х) дасужа.
Нашай бабкі ўжо нет,
Пастаночкі дзе як свет.

— " — " —

Запісаў С. П. Сахараў 12 ліпеня 1938 г. ад Агаты Невяроўскай, 66 г., [illegible] ва [illegible] (сама родам з в. [illegible]) Прыдруйскай вол.

---

Дзе заўвіцца калінка ў лозе,
Дзе завярнула Марцінка ў палозе,
Дзе зажадала вішнёвага соку
— Дзе пакінуце матчыну з бокі,
Каб раскапарала вішнёвага соку
— Кам на дачку, дзік я і з [illegible]
А кам на сына, дзік я [illegible]

— , —

### Калыханка

Калі [illegible] гіла
Малапочак [illegible]
Люлі, люлі, кавалек,
Падарую малапок.

— , —

Запісаў С. П. Сахараў 12 XI 1938 г. ад [illegible] Нейзберт [illegible]

---

х) Пастаночкі — [illegible] куды [illegible] закуты бабе [illegible] радзінах(?)

# Хрэзьбінная і дзіцячыя песні

## Бабке

Наша бабка ня дужа, ня дужа.
Пастаночкі x) дасужа.
Нашай бабкі яе нет,
Пастаночкі дык як свет.

— " — " —

Запісаў С. П. Сахараў 12 ліпеня 1938 г. ад Агаты Невяроўскай, 66 г., пражываючай часова пры ст. Індры (сама родам з в. Брэйтмары, Прыдрузкай вол.

---

Ды зацьвіцела калінка ў лазе,
Ды захварэла Марылька ў палаце,
Ды зажадала вішневага соку.
— Ды паклічце майго мужа з току,
Каб разстараўся вішнёвага соку.
— Калі на дачку, дык я і з току не пайду,
А калі на сына, дык я і мёду прынясу.

— " —

## Калячанка

Каля кузьні ішла,
Малаточак знайшла,
Любі, любі, кавалек,
Падарую малаток.

— " —

Запісаў С. П. Сахараў 12.XI.1938 г. ад Уршулі Недзжборт (па бацьку-Белятская) у м. Розе.

---

x) Пастаночкі = кусок кужалю хамцовага дасцца бабке ад ад радзільніцы

Дзіцячыя песні.

Ходзіць шавец каля плоту,
Пытаецца на работу:
-Мая міла гаспадыня,
Ці ня здохла гдзе кабыла?
-Вось там на даліне
Здохлі ў пана дзьве кабылы,
Адна чорна, друга - лыса,
Адна ўчора, а другая - сёньня

—— " —— " ——

Запісаў С. П. Сахараў 12. XI. 1938 г.
ад Уршулі Нейжбарт (па бацьку - Беляўская)
у м. Рэзе

Як і быў у нас казёл,
Ён і вумны быў,
Ён і па ваду хадзіў,
Ён і кашу варыў,
І дзеда з бабай карміў;
Як пайшоў наш казёл у лес,
Напалі на яго роўна семяра ваўкоў.
Як і былі нашы ваўкі галодны
Як хвацілі казла папярок бачка,
Куды рожкі, куды ножкі,
Куды весь казялёк.

—— " ——

Запісаў С. П. Сахараў 15. VII. 1938 г.
у м. Краславе, ад Віктара Панкіна,
11 год.

## Хрэзьбінскія і дзіцячыя

Бабка кашку нясець, а кум казной трасець,
У бабы кашка смашна, а ў кума казна ясна,
Тайчы, малоць ня дужа
Да пастаночкаў дасужа,
Тайчы, малоць, ах ці мне?
А пастаночкі-ж дайце мне.
Міколка, косінькі варатак,
Ні сядзі разінуўшы ратык.

Запісала матурыстка Дзвінск дзярж. белар. гімназіі Антаніна Лукашэвіч ад Гелены Лімяшонак, 70 г., 9 кастрычніка 1939 г., ч. в. Мураванка, Букмуйжскай вол. Рэзэкнескага пав.

— " —

У балоце на калодзе
Мядзьведзь боты шыець,
А малыя мядзьвежаты
Шоўкам падшываюць.

— " — " —

Ціна кашу варыла,
Малых дзетак кармила
Аднаму дала, другому дала, трэцяму дала, етаму дала.
А ты малы пальчык іді
Сам сабе кашы навары;
Тут пень, тут калода
Тут мох, тут балота,
Тут цепленькая вадзіца (прыгаворваючы щэкоць дзіця пад пашкай)

— " —

Запісала Вольга Сахарава па памяці
З дзіцячых год — 1939 г. 18 кастрычніка

## Дзіцячыя песьні

Ішоў бай па сьцяне,
Нес чэцера лапцеў,
І сабе, і жане
І дзяцёнку па лапцёнку,
Ці баіцца, ці не?

— " —

Ішлі козы рагатыя, багатыя,
Каго пападу, таго забаду
Аксютку папалі,
Аксютку забадалі,
Будзык, будзык, будзык.

— " — " —

## Беларускія прыказкі

Ня руш мяне, ня чапай,
Я табе ня роўня,
Ты шавец, ты кравец,
А я бандароўна

— " —

Хто з кім, хто з катораю,
А я усе з сваею Хадораю

— " —

Запісала Вольга Сахарава
па памяці з дзіцячых год —
1939, 18 кастрычніка, у Рызе

# Для забавы дзетак

Чы-ры, чы-ры сарочанка
Дзе была далёчанка?
Была ў пана на таку
Ходзіць жораў па таку
У чырвоным калпаку,
Носіць шаблю пры баку,
Усіх людзей пералякаў,
Пайду сам за раку,
Дзе там людзі гамоняць
І мост масцяць,
Серабром гваздзяць.
Мой татка гасудар
Купіў мне сарафан
Ні долаг, ні каротак
Толькі по лесу хадзіць
Жэўчык зайцоў лавіць,
Варона старажона
Пашыла жыта жаці,
А мядзведзь на бару
Бортні падшывае
А сініцка-сястрычка
Пашые мне кашульку,
Прывязу я жану
І за стол пасаджу
І ўсім людзям пакажу.

— „ — " —

Запісаў С. П. Сахараў 29 ліпеня 1939 г.
ад Гертруды Слядзеўскай, 40 год, у в.
Савеляшкі, Пасінскай вол., Лудзенскага
пав.

## Для забавы дзетак

Гаю-гаю я беса патлаю
Хвост пэрэч адарву,
А рогі зламаю;
Як я была малада
Тады была рэзва.
Цераз плот і ў гарод
Сама пералезла.

―――――― ,, ――――――

## Прыпеўка к 1ч. кадрылі на матаў полькі

На гарушке хатка, пад гарою уліватка,
там граюць і сьпяваюць малыя рэбяткі;
адну зваць Мальвінкай, а другую Кацярынкай
А трэцюю сам ня знаю – малада дзяўчынка.

―――――― ,, ――――――

Запісаў С. П. Сахараў 29 ліпеня 1939 г. ад Гертруды Ададзецкай, 40 г., у в. Савачнікі, Наст-скай вол., Лудзенскага пав.

## Замовы.

Запісаны С. П. Сахаровым 1 ліпеня 1939 г. ад Вікторыі Дамчонак, 80 гад, ув. Шушкава, Нікавенск. вол., Лудзен. пав.

1. ад скулы.
Ішоў свенты Пётра цераз мост, стаіць гура Кальварыйская, на гэтай гуры стаіць пан Езус з наісвенцшай Маткай, у сваіх руках трымаюць дубцы, білі секлі гэту бол, высякалі. Амень. (3 разы)

2. ад гада. перахрасьціцца 3 разы і казаць: пойдзем у лес зьбі-
Пайду ў лясок, высяку дубовы кіек, гад паласаты,
раці гадаў: гад сівы, гад рабы, гад чорны,
гад руды пойдзем к Богу на суд. Бог паможэцца і я памагу. (3 разы). Потым прачытаць – Здраваацца Марыі. Амень.

3. ад худога воку. Нада перахрасьціцца, тады 3 разы
Здраваацца Марыі прачытаці і потым сказаць: Ні я памагаю, сам гасподзь бог памагае, сьвяты Юры, Ягоры, ад дзе-
злога глаза, ад старых валасоў, ад сівой барады, ад дзевушак, ад бабушак, ад малых рэбятушак, у сталі божка
на помач ад злога воку. Амень. (3 разы)

―――――― ,, ――――――

# Дзіцячыя песні

Кую, кую ножку
Паеду ў дарожку
Куплю чаравічкі
Малы не вялічкі
На Валюшкіну ножку
Кую, кую другую
Паеду ў другую.

— „ —

Лады, лады ладкі
Малые рабяткі
Гарох малацілі
Цапы паламалі

— „ —

Лады, лады ладкі,
Гдзе былі ў бабкі,
Што елі кашку
А што пілі бражку.
Кашка маслічная,
Бражка смашненькая.
Папілі, паелі,
Дамоў паляцелі,
На вароты селі
Ладушкі запелі.

— „ —

Із дзіцячых успамінаў
Ольгі Сахаравай
22 студзеня 1940 г.

# Дзіцячыя песьні

Жыў-быў у бабулі
Шэранькі казьлік
Вось як, вось як
Шэранькі казьлік.

—

Бабуля казьліка
Дужа любіла
Вось як, вось як
Дужа любіла

—

Уздумалася казьліку
У лес пагуляці
Вось як, вось як
У лес пагуляці.

—

Напалі на казьліка
Шэрыя воўкі
Вось як вось як
Шэрыя воўкі

—

Пакінулі для бабулі
Рожкі ды ножкі
Вось як, вось як
Рожкі, ды ножкі.

---

Уз дзіцячых успамінаў
Ольгі Сахаровай

22 студзеня 1940 г.
г. Рыга

## З вясельных песень

Берыць Алінька Люкадку ў добрай славы
Пуховы падушкі праз-за дверы,
Каб жыла, ні прасіла ў суседа абеда,
Каб ні стаяла цемную ночку пад вакном,
Каб ні ўбівала скоры ножкі па хатам,
Каб ні ўцірала гарачыя слёзы рукавом

— „ — „ —

Прыехаў сват первы, такі няверны.
Ні пайду я мамінька, ні пайду мілюсенька,
Яшчэ маладзюсінька! (прып.)
Прыехаў другі, такі нідалугі; (прып. ні пайду...)
Прыехаў трэцці, такі шаракаплечы; (прып.)
Прыехаў чацвёрты, такі нідапёклы, „
Прыехаў пяты, такі касалапы, „
Прыехаў шосты, такі няшустры; „
Прыехаў семы, такі нівясёлы; „
Прыехаў восьмы, такі нідарослы; „
Прыехаў дзевяты, такі нібагаты, „
Прыехаў дзясяты, такі прыгожы і багаты,
Ужо пайду мамінька, ужо пайду мілюсінька,
ужо ні маладзюсінька

— „ —

Запісала матурыстка Дзвінскае дзярж-
беларускае гімназіі Антаніна Лукаша-
віч у в. Муравінка, Буклуцкай вол.,
Рэзекнескага пав. ад Гелены Лімяшо-
нак 70 г., — 9 жніўня 1939 г.

# З вясельных песень

Нашы коні да тупу, тупу, (па 2 разы)
Ой нашы коні да тупу, тупу
Прывязалі ня вам ступу,
Ой, ня ступу да калодзіцу,
Ой, ня дзеўку да маладзіцу
Ой, чаго свахі ня сьпяваеце
Алі голасу ня маеце,
Парабіце горла з рэпы,
Каб умелі песні пець

— " —

Сівы коник да ваду ідзець,
А Матрошенька ды пад печь лезіць
Ванька думаў, што-то мышь полева
Ажно гэта Матронька малада

— " —

Мы былі да ў попа, у попа
Заплацілі тры рублі, тры рублі
Тры рублі да залоценькі,
Наша маладая маладзенькі

— " —

Запісаў С. П. Сахараў у жніўні
1939 г. ад Марыі Зяткевіч, 28 год,
у в. Старая Слабада, Лудзенскага
пав.

## З вясельных песень



### Калі прыедуць ад нявесты і пасадзяць к сталу ў жаніха

Гаспадыня тужыла, што большая дружына,
А гаспадар таму рад, што ўсім госьці ў рад,
Да ў рад, ў радочак, як пчолкі ў мядочак
Слаўна, слаўна нашага Адамкі дружынька
Прыехалі паслі як паненяткі,
А шчабячуць як салавейкі,
А пашчабятаўшы палецяць як пташачкі

—— „ —— „ ——

### Надкосніку (ам) сьпяваецца

Ды ня стаў Юміська конікаў пад рабінаю,
Рабіна дзераўца няшчасьлівае,
Рабіну з вярхоўкі пташанкі клююць
Рабіну з карэння чэрві точуць,
А стаў Юміська коніка пад бярозаю,
Бяроза дзераўца шчасьлівае,
На бярозе пташухня салаўі пяюць,
У бярозе сучанькі сушываюцца
У бярозе лісьцянкі зьліпаюцца
Маладому Юміські дзеванькі ўкланяюцца

—— „ —— „ ——

### Сьпяваюць нявесьце, але ў хаце жаніха

Хадзілі сястрыцы ды па святліцы
Тужылі ды плакалі па сястрыцы
— Сястрыца наша перапелачка
Аддалі мы цябе за адно словечка,
Ды ня год, ня два гадавалі
Ды за дзень, за два прагулялі

—— „ —— „ ——

Запісаў С. П. Сахараў 12 ліпеня 1938 г
ад Агаты Невяроўскай 66 год, з вескі
Брэдмары, Прыдруйскай вол., але часова
пражываючай при ст. Індра за службу
ў жыдоў.

З вясельных песень 

У жаніха пяюць, але для нявесты

Вянок, вянок Юзефка,
А Мальвінка малюсенька,
Яна яму мілюсенька,
У мамкі гадавалася
Яна яму спадабалася
У шчаслівы дзень радзілася
Яна яму прыгадзілася

———,, ———,, ———

Для нявесты, як ад'язджаець ад другіна з двару жаніха.

Брацішкі на коніках
У золата убіваюцца
Сястрыца за столікам
Сьлёзкамі абліваецца
— Браццікі мае родныя,
Як паедзеце дамоў
Вазьміце і мяне з сабоу (к)
— Сястрыца наша родная
Не на тое давалі,
Каб назад бралі,
А на тое аддалі,
Каб за табой пагулялі,
Твайго сьвекру, а нашага свата
Піва папівалі,
Яго піва пьянае,
Яго дзіва дзіўнае

———,, ———,, ———

Запісаў С. П. Сахараў 12 чэрвеня 1938 г.
ад Агаты Невяроўскай, 66 г., часова
працаваўшай пры ст. Індра

З вяселньх песень

## У нязвелю нявесьце, як да шлюбу прыбіраюць

Закукавала шэра зязюля ў садочку
Прыклаўшы буйну галоўку к лісточку,
Ты лісточак, ты зялёны, да ты мой,
Ці будзеш зімой зялены як у леце?
— Хоць я буду на услонейку стаяці,
Я-ж ня буду зімой зялёны як у леце,
Будуць мяне буйныя ветры збіваці,
Будуць мяне злыя марозы з"едаці.
Тады заплакала малада Мальвінка за сталом,
Прыклаўшы беленькі ручкі к століку.
— Вы ручанькі, вы бельі, вы мае,
Ці будзеце ў свякроўкі белыя як цяпер,
Хоць я буду ранюсенька уставаці.
Некалі будзе гладка галоўкі учасаці,
Некалі будзе беленьких ручак умываці,
Будуць мяне ближнія суседкі гудзіць:
Ляніваяя, дрэмліваяя Мальвінка!

— " — " —

Для свацці

Села наша сваценька на куце
Растапырылася,
Ад яе лавачка уламілася
ад ейнага золата лавы ломяцца
ад яе срэбра сцены шчэпляюцца

— " — " —

Запісаў С. П. Сахарэвіч 12 ліпеня 1938 г.
ад Агаты Невярроўскай, 66 год, прак[?]
часова прыст. Індра

# Вясельныя песні

## Калі дружына нявесты уезжаець з дому жаніха.

Едьце сваты дамоў
Ня гудце*) нашых двароў.
Нашы двары пагудзіце
І самі паблудзіце
Ды па мхах, па балотах
Па дубовых калодах.

*) Не ганіце (не осуждать) двароў
гудзіць каго — осуждать, хаять

— „ —

## Кубельніку, як толькі прыедзець у дом жаніха.

Наш папунька авес тоўк,
авес тоўк,
Пад паліцей з маладзіцай
Барада ў муце
Сіска ў руце

— „ — „ —

## Вясельная прыбаўтка для усіх

Богу на чэсьці, на хвалу
У гароси калосься
А ў ячмяні стрыкі,
А цялятки гладкі,
Хвасты як бічы
Каб было за што браць
За плот валачы

— „ — „ —

Запісаў С. П. Сахараў 12 июня 1928,
ад Агаты Невяроўскай, 66 г., прачкова
ючай часова прост. Індра.

З вясельных песень

Сьпяваюць у нядзелю перад адпраўкай у царкву ці касьцел.

Скажы, скажы, малада Юзэфка, усю праўду,
Ды хто цябе сення ранenька пабудзжаў,
Ды хто табе гладка галоўку часаў,
Ды хто табе мярцяны вяночак усклада́ў,
Ды хто табе варанычъ коняў запрачаў?
— Цёценькі-суседанькі, скажу я вам усю праўду:
Пабудзжала сення раненька мамунька,
Учасалі гладка галоўку сястрыцы,
Ускладала мярцяны вяночак мамунька,
Прышпілялі мірцян вяночак сястрыцы,
Запрагалі варанычъ коняў брацішкі

---

Чырвоная рожа над ракою стаяла
На яе раса пала,
На яе раса пала, на яе халодная
Там Мальвінка хадзіла
Расіцу аббірала, расою умывалася,
Да шлюбу прыбіралася
Паспешайся Мальвінка, паспешайся малада,
Тамъ цябе дажыдаюць
Касьцёл адмыкаюць,
Каберцы засьцілаюць,
Там табе ручкі зьвязуюць
Шчырую праўду скажуць

Запісаў С. П. Сахараў 12 лiпеня 1938 г. ад Агаты Неварыўскай, 66 г.
пр. ст. Індра

З вясельных песень

Як прыезджаюць с касцёлу ці царквы, сядуць за стол і пяюць:

Стаська маладзенькі,
У яго конь вараненькі,
Конь вараненькі
Сярэбрана сядзельца
Уздечачка залатая,
Паненька маладая,
Маладая маладзюсенька
Яна яму мілюсенька.

— " — " —

Ксяндзу а. Я. Гайлевічу x)

Наш пробашч любіць госьці, любіць госьці,
Нам сказалі ў яго сыра есьць, сыра есьць.
Яго мамка паўчыла,
Каб ён нам даў паўсыра.

x) Ксёндз а. Я. Гайлевіч, беларус па паходжа-нню, каля 10 год служыў у Бальбіноўскім касцёле (зараз служыць у Даўгаўпілсу). Тры-маў сябе з сваімі парафіянамі дужа про-ста, гутарыў з імі і казаў прамовы толькі па беларуску, чым заслужыў вялікую пашану і любоў з боку сялян. Сяляне заўсёды запрашалі кс. Гайлевіча на свае сямейныя урачыстасці і ён быў самым жаданым госцем.

Запісаў С. Н. Сахараў 12 ліпеня 1938 г. ад Агаты Невяроўскай 66 г., прыст. Індра.

## З вясельных песень

### Баярки

Гуц-гуц, гуца ца замуж хочацца
Бог дом ні дасць, ніхто замуж ні бярэць

—— „ ——

Ні нада там сьвяціцца,
Гдзе Люкадка сядзіць,
Сьвяцюць яе каралькі,
Залатыя іспадкі, сярэбраныя пярсьценкі,
Ад золата лаўкі ломяцца
Ад серабра сьцены гнэпяцца

—— „ —— „ ——

Ты, Марыля, ні сядзі для сьценкі блізка,
Нашы мальцы праворны,
Сьценку прадзяўбудзь,
Цябе маладую украдуць
І на рынак павядуць,
На баранкі прададуць

—— „ ——

### Надкосніку

Наш Стасік панич,
У красапаўцы бочу, вянок віў.
А ў Вільні даваў,
Нашым дзеўкам дараваў

—— „ ——

Куска хлеба ні маю, а жаніцца жадаю

—— „ ——

Каля платы крапіва мальцам на піво
У восіцы (васеці) саладок дзеўкам на мадок

—— „ ——

Запісала матурыстка Дзьвінскае дзярж. беларуск. гім-
назіі Антоніна Лукашэвіч ад Эміліі Барсук, 60 г., ў в. Лоставкі,
Букмуйжскай (Вайводаўскай вол.) Рэзекнескага пав. 10 VIII 1939 г.

# З вясельных песень

## Сваццi

Мы на цябе сваццiнка спадзiвалися,
Тры пaлi чатыры пiхатой iшлi,
Быстру рэчыньку мы ў брод плылi

— " — "

## Надкоснiку (шаферу)

Падкоснiчак пiтушок, чаго рана прыляцеў
Цi пiць, цi есьць захацеў?
Нi пiць, нi есьць нi хачу, за сястрыцай палячу

— " —

## Свату

Сваточак, цi любiш параcяцiнку?
Жаночкi-лябедкi, то iда мая
Сваточак, цi любiш маладу жану?
Жоначкi-лябедк, то душа мая

— " —

## Баяркi

Ах ты Ганулька, ягодка мая,
Панаравiлася мне паходка твая:
Як iдзеш — нi пашэшуся,
Як сядзiш — нi нагледжуся

— " —

Наша Галенка — полацкая мiшчанка,
Казам ў цябе багатыя падаркi,
Казамi ў цябе салодкi цукеркi
Вялiка баранкi

— " —

Запiсала матурыстка Дзвiнскае дзярж. беларускае гiмназii Азтонiна Лукашэвiч ад Эмiлi Барсук, 60 год, у в. Ластаўкi, Букмуiжскай вол., Рэзекнескага пав., 10 жнiўня 1939 г.

З вясельных песень

Сьпяваюць за сталом

– Старшы сват, ці любіш парасяцінку?
– Жоначкі-лябедачкі, то яда мая.
– Старшы сват, ці любіш маладу жану?
– Жоначкі-лябедачкі, то душа мая.

— " — " —

Хваліцца Стасенька маладой жаной:
Есьць у мяне жоначка як баярыня,
Ростам яна тонка высока
Ліцом яна бела румяна,
Броўцы яе чарнабровыя,
Глазкі яе сакаліныя,
Слоўца яе ўсе верныя

— " — " —

Ты Стасенька па дарожаньцы едзеш,
Пры кім сваю маладу жану кідаеш?
Жоначкі-лябедачкі, ні адна яна
Есьць у мяне тры казачанькі напятыя,
Адзін казак будынкі будуець
Другі казак пашыначкі x) пільнуець,
Трэці казак маладой жаны слугуець

— " — " —

Запісаў С. П. Сахараў 1 жніўня 1937 г.
ад Віктора Даметонак, 80 г., у в. Шышкава
Шкавенскай вол., Лудзенскага пав.

x) Пашыначкі = запаханные поле

## З вясельных песень

Прытушыня стралец Бронічка,
Забіў мядзьведзя сюды едзя
Забіў сароку сярод току,
Забіў варону сярод двору,
Забіў цецеру сабе на вячэру
Забіў сініцу ў сьвятліцы

———„———„———

Едзьце госьці да дому, да дому
З'елі коні салому.
Каля плоту крапіву
Каля току лякну

———„———

Багатага гасьцёк Стаська
Ня прынес-жа ён ды прывез
Дзевяць вазоў золата
А дзесяты воз серабра

———„———„———

Да ты-жа пеў, Стаська, упіваешься
На каго ты спадзяваешься?
— Я спадзяваюся на сваю маладу жану
Яна мяне пьянага пераймiць
Разуіць, раздзеніць, на белу пасьцельку паложыць
Куньяй шубай пакрыць, абніміць, пацалуіць

———„———„———

З саду, з саду вінаграду
У тым саду ложа белае
На тым ложы Стаська ляжыць,
У яго галавах жана стаіць.
— Ты ўстань, Стаська, прабудзіся
На табе чарачку — пахмяліся,
На цукровая яблычак — на закуску

———„———„———

Запісаў С. П. Сахараў 1 жніўня 1934 г. ад Вікторыі Дамчонак 80 г., у в. Шушкава, Шкавенскай вол., Лудзенскага пав.

# Вясельныя песьні

## Як за сталам сядзяць сьпяваюць:

### а) Гаспадару

У нашага гаспадара кудравая галава,
Кудравая галава, шаўковая барада,
Ён кудзеркамі патрасець,
Гарэлачкі падніясець,
Нам сястрыцам чатыром
Гарэлачкі з лапяром*) *) лапяр = дерев. миска, выскрабаная
Ды ён нясець мармочыць,
А даць нам ня хочыць

———— " ———— " ————

### б) Жанчынам-госьцям

А вумная, разумная Міхалінка,
Паставіла белы шацер у полі,
Пад тым шатром дуды-музыкі граюць,
Там яе сынуленькі гуляюць

———— " ————

Зіма-лета ёлка, сасонька зялёна,
Наша Міхаліна малада і хароша.
- Вы, жоначкі, за тое я малада і хароша,
Што у свайго мужа ня біта, ня журона

———— " ————

### в. Хлопцу

Скакаў салавей на стале,
На калена ў золаце,
На запяцьцю — у серабры.
Паймай сабе салаўя,
Вазьмі сабе золата і чыстае серабра,
Як будзем жаніцца, табе згадзіцца

Запісаў С. П. Сахараў 1 чэрвеня 1939 г. ад Вікторыі Дамчонак, у в. Шушкава, Шкавенскай вол. Лудзенскага пав.

## Вяссельныя песьні

### Маладзенцу (маладому) як сядзяць за сталом

Хто-ж там у каморы ціха гаворыць,
Ганачка Язэпку навучаець:
– Ты слухай Язэпка маю мамуку
– Я тваю мамуку ўперад слухаў,
Я зганяў конікаў сюды езьдзя,
Я сабраў боцікі па сянёх ходзя
Збузаваў (зьмяў) шапухну ўкланяяся,
Сьцёр ды зьмяў хустачку уціраяся
На цябе малады спадзяваяся

— " — " —

На том на сем, на сіненькім вазёрку,
Ды там Язэпка белых лебядзей страляець,
Ня так страляіць,
Як на сваю Ганачку вочыхнам міргаіць;
– У каго, у каго мая Юзэпка удалася,
Па паяс у золата вілася,
Па белы плечы ў чыстае серабра,
Пусьціла касу па залатому паясу

— " — " —

### Хлопцу

Чаму-ж ты, Броннічка, сам не жаніўся,
Ці табе, Броннічка, дзевак ня было,
Ці табе, Броннічка, ячмень ня ўрос,
Ці табе, Броннічка, хмялёк ня віўся?
– Былі дзеўкі, былі дзеўкі, ды ўсе маленькі
Рос ячмень – куры склявалі.
Віўся хмель – козы зглядалі

— " —

Запісаў С. П. Сахараў 1 ліпеня 1939 г.
ад Вікторыі Дамчонак 80 г., у в. Неушкава, Шкавенскай вол., Лудзенскага пав.

# З вясельных песень

Ой каліна ой маліна
Усе лугі пабяліла, берагі накрасіла
Ой маладая дзеванька
Усю радню звесяліла, а матульку засмуціла,
Уся радня скачыць, пляшыць
А матулька тужыць, плачыць

---

Конікі іржуць, іржуць,
Багатырачку вязуць, вязуць,
З скрынкамі, з пярынкамі,
З пуховымі падушкамі

---

У чыстым полі яліначка стаяла,
А па магілцы сіратанька хадзіла,
Яна сваю родну матку будзіла
— Устань, устань мая матулька, ні ляжы
Хоць-жа ты мне гэту ночку памажы
— Рада-б я устаці к сваёй дзіцячці, парадачак даць
Жоўты пясочак засыпаў вочкі — ні гляну,
Дубовы дошкі сціснулі ножкі — ні устану
Зялёныя цьвячкі сціснулі плечкі — ні крану
— Ды устануць буйны вятры у полі,
Разнясуць жоўты пясочак па полі
Ды паднімуць маю матульку на ногі

---

Запісала вучаніца беларускай пачатк. школы Марыля Барысенак ад сваёй маці у в. Бартулі, Чэрвенскай вол. у восені 1927 г.

# З вясельных песень

Наш Анталька крапчыны стралец,
Забіў сароку пасярод току,
Раненька забіў сініцу ў сьвятліцы,
Забіў лісіцу жонцы на варатніцу,
Забіў заенца на тры тысенца,
З тым таварам заехаў панам

— , — , —

Аглянісь на сябе, што дзеецца на табе
На тваей галованцы шапачка пуховая,
А на той шапаньцы салавей сядзіць,
Пяець песьні, песьні дзіўная, сьвятыя

— , — , —

Браціткі на коніку шапкам увіваюцца.
Дзеванька за столікам сьлёзкамі абліваецца.
— Брацітка мае родны
Як паедзіцца дамоў вазьміце мяне з сабой
— Ні на та мы цябе аддалі
Каб дамоў з сабою бралі,
Калі добра будзеш жыць, мы адведаем
Калі будзеш гараваць — зязюлю прышлем
Зязюля будзіць кукаваць,
Памагаць табе гора гараваць.

— , —

Запісала вучаніца беларускай пачатковай школы Марыля Барысёнак ад сваёй маці у в. Парпуцы, Кідрускай вол. у восені 1927 г.

## З вясельных песень

Сядзіць зайка пад елкаю вочкі трэць,
Едзіць суджанька к цясьцютку яго б"ець.
- За што, за што малады суджанька мяне б"еш,
Ці я табе дарожаньку таробіў,
Ці я табе варанога коніка распудзіў,
Ці я табе маладудзеваньку адгудзіў?
Прабілі дарожаньку шэры вайкі,
Распудзілі варанога коніка галубцы,
Адгудзілі табе дзеваньку малайцы
Яно гудзілі, сабе хацелі ды ні ўзялі

—— " ——

Да чэго конік вараны некаваны,
Перакочаў трое варот у гарод,
Да патантаў руту-мяту ля варот,
Стала дзеванька па зелачкі тужыць,
Стаў же малады суджанька уні маці:
- Ні тужы, малада дзеванька, па зелачкі,
Есьць у мяне лепшы зелачкі за твае
Ты ў мяне будзеш у дзень па садзе хадзіць,
Ты ў мяне будзеш з мірта вяночык насіць.
- Каб столькі ведзьма па гэтым сьвеце хадзіла,
Колькі я буду ў цябе па садзе хадзіць,
Колькі я буду мірцін вяночык насіць

—— " ——

Запісала вучаніца Калацкай беларускай пачатк. школы Марыця Барысёнак ад сваей маці у вёскі Бартулі, Кругаградскай вол. у восені 1927 г.

# З вяселлячых песень

Ходзіць, паходзіць ясен месяц па небе,
Лічыць, палічыць дробныя зьвезды па небе,
Недалічуся аднэй зьвездачкі-зарыцай пашла,
Зарыца ясному сонцу пашла служыці
Ні на дзянечык, ні на гадочык, на ўвесь век
Ходзіць, паходзіць родны татулька па двару,
Лічыць, палічыць усю сямейку ў даме,
Ні далічуся аднэй дзіцяці ў даме,
Пашла дзіцяця чужому татку служыці,
Ні на дзянечык, ні на гадочык, на ўвесь век

——— " ——— " ———

Ехаў суджанька цераз цёмны лес,
Выламаў, выразаў тры розачкі,
Сьцібануў коніку пад ножачкі.
-Бяжы коню мой к цясьцюотку ў двор,
Стукні капыткам у вароцікі,
Каб сталі вароцікі пасярод двору,
Каб вышаў-бы цясьцюотка мяне прымаць,
Каб вышла дзеванька мяне ўзнаваць

——— " ——— " ———

Я ў садочку была, вяночык віла,
Рутачкі мала стала.
Прыняслі, божа, гасьця любага вяночык давіваці!
Едзіць суджанька, рутачкі вязець вяночык
давіваць

——— " ———

Запісала вучаніца Калаўскай беларус. пачат. школы
Марыля Барысенак ад сваей маці у вескі Барту-
лі, Крыдрубскай вол. у восені 1927 г.

# З вясельных сьпевау

## Як сядзяць за сталом сьпяваюць

### а) для усей кумпании

Нашы госьцікі ядуць
Як курачкі клююць,
На стале ні крошачкі,
Пад сталом ні косточкі,
Ешьце госьці рэпу,
У нас морквы нету,
Бо ту Парсюк Максім,
Вырвау маркву зусім,
А сівая свіньня па двару валачылася,
Са сьмеху пакацілася

——— " ———

б. Хрэснай матке пяюць бабы, калі абіраюць падарункі.

Мы на цябе спадзявалісь хрэсная матухна,
Тры полі, чатыры пехатою ішлі,
Быструю раку у брод брылі.
Яшчэ куньню шубу на плячоках нясли.

——— " ——— " ———

в. Хрэснаму бацьке

У хрэснага татки кудрава бародка.
Шаўковая бародка,
Вадзілі хрэснага татку па піру,
Па дзявоцкаму вясельлю,
Макау бародку ў віну, у гарэлку
У салодзенькі мядок.

——— " ———

Запісау С. П. Сахарау 1 ліпеня 1939 г., ад Вікторыі Дамчонак, 80 год, у в. Шушкава, Шкавенскай вол., Лудзенск пав.

## З вясельных песень

### Старшаму свату сьпяваюць, як за сталом сядзяць.

Добра сват прыбраўся
Путам падперазаўся
Барада пянькой сшыта,
галава клінам збіта,
Шубухна ў яго цялячья,
Шапухна – сабачья,
Боцікі ў яго парасячы,
Ён шубухнай цірнецць
А цялёнак раўнецць,
Ён шапухной махнецць
І сабачка брахнецць;
Боцікомъ ціснiць
Парасёнак пiснiць

### Для усей кумпаніі

Ешьце госьці дужа ў багатага мужа,
Есьць піва піўніца, меду медуніца,
Гарэлачкі купа (жбан),
Даець ен ня скупа;
Вы госьцікі любімыя гасьцiце ў нас
У нас піва наварана – усе для вас,
У нас віна накурана – усе для вас
У нас хлебы бумажныя (пшанічныя) – усе для вас,
У нас страўкі сахарныя – усе для вас
Напітачкі салодкія – усе для вас

Запісаў с П. Сахараў 1 жніўня 1939,
ад Вікторы Дамчонак, 80 год, у в Шушкова, Шкавенскай вол, Лудзенскага пав.

# З вясельных песень

## Сьпяваюць надкоснікам (шаферам), калі сядзяць за сталом.

Наш Бронічка-прастата
Купіў каня бяз хваста,
Паехаў жаніцца,
Прычапіў карыцца,
А карыцца шлапочыць,
Увесь народ хахочыць

— " —

А беленькі, кудравенькі Бронічка,
Хто-же табе гэтыя кудзеркі зачасаў?
Паздароў божа маю мамушку,
Учора-звячора са сьвячой часала,
Учасаўшы ўму-розуму навучыла
І ў добрыя людзі пусьціла.

— " —

А хто ў нас харошы,
А хто ў нас прыгожы?
Бронічка харошы, Бронічка прыгожы,
Ён хораша ходзіць
Маёрна ступаіць,
Сапог ні ламаіць,
Ён каня сядлаіць,
Конік з ім іграіць,
На коніка садзіцца,
Конік весяліцца
І сам паедзіць жаніцца

— " —

Запісаў С. П. Сахараў 1 ліпеня 1939 г., ад Вікторыі Дамчонак, 80 г., ў в. Шчышкава, Шкавенскай вол., Лудзенск. пав.

З вясельных песен

Шаферыцам сьпяваюць за сталом

Харашa прыгожанькa наша Ганначка,
Ей ня многа нада прыбрацьъ
Толькі адны шатыx) да пятьі
Чырвоныя істужкі па вушкі.

x) шата – дарагое плацьце

––– " –––

Дзе сядзіць Юзенка, бацькава дзіця,
Не нада ні сонца, ні месяца,
ад золата грудзі ломяцца ей,
ад серабра іскры сыплюцца,
ад цехвяныхx) чаравічак маея ломяцца.
– За тое жоначкі, што я малада

x) цехвяных – сафьяновых

––– " –––

Дзе Геленка сядзіць,
Там не нада сьвяціць,
Сьвецюць яе каралічкі,
Залатыя шпоначкі,
Сярэбраныя пярсьценочкі

––– " –––

Ой жаркі, жаркі Нашай Юзефкі каралкі,
За тое жаркі, што цэю ночку ня спала,
Яна свае жаркі каралкі чапала.

––– " –––

Запісаў с Т. Сахараў 1 ліпеня 1939 г. ад Вікторы Дамчонак, 80 год у в. Шушкова, Шкавенскай Гм. Лядо Скорапнскай вол. Лудзенск пав.

## З вясельных песень

Кальнула маткі ў грудзі
Што нада дачку аддаць у людзі,
Кальнула маткі ў пяты (ў пяшы)
Што некаму глядзець хаты,
Да чыя там лілія
Сярод столу цьвіцела,
Да чыя там малучна
Сярод хаты замлела?

— " —

Ягадка з ягадкай пры бару расьлі
Узросшы яны, выраслы сакацілася;
Петрачка з Адэлькай пры вёсачкі расьлі,
Узросшы яны, выраслы схадзілася,
Да за адзін столік садзілися,
Адным кусочкам дзялілися,
Адным кубачкам віталіся

— " —

Зяленая рута мята,
Ці баішся ~~ты~~ марозу?
Я марозу ні баюся
На вуліцы разцьвітаю.
Маладая ты Магдыська,
Ці баішся ты маладаго Янечку?
— Я Янечку ні баюся
На кравацьі спаць з ім кладуся
Ранюсенька прабуджуся
І Янечку прыгажуся

— " —

Запісала матурыстка Дзьвінскае дзярж. бела-
рускае гімназіі Антоніна Лукашэвіч ад
Сікслы Урбановіч (па мужу Анжан), 45 г.,
ў в. Забінякі, Букмуйжскае вол. Рэзекнескага
павету, 12 жніўня 1939 г.

## З вясельных песень

Рэчка з рэчкной разліваюцца,
Божа-ж мой! (прыпеўка)
А Кацярынка з мамкай разлучаецца,
А як мне жаль, а як мне тошненька
Божа-ж мой
Рэчка з рэчкной разліваіцца,
А Кацярынка з таткай разлучаіцца
А як мне жаль, як мне тошненька
Божа-ж мой!
Рэчка з рэчкной разліваецца,
А Кацярынка з сястрычкамі разлучаіцца,
А як мне жаль, а як мне тошненька
Божа-ж мой!
Рэчка з рэчкнай разліваіцца,
А Кацярынка з браціткамі разлучаіцца,
А як мне жаль, як мне тошненька
Божа-ж мой

— " —

## Маладухі

Баярычкі падманачкі,
Вы мяне падманулі,
Учора з вячора вы мне казалі,
Пойдзем у зялен садочак вянкі віць,
Сабе звілі з рута, з ліліі вянкі,
А мне звілі з калючага вянічку,
Ельнічак колець галоўку клюніць,
Божа-ж мой!
І старому, і малому
Усе ў кожухнэ.

— " —

Запісала матурыстка Дзвінскай дзярж. белар. гімназіі Антаніна Лукашэвіч ад Сікеты Урбановіч, 45 г., у в. Забінякі, букмуйнскай (Вайвадоўскай) вол. Рэзекнескага пав. 12 жніўня 1939 г.

З вясельных песень

Для нявесты перад ад'ездам да вянца

Снаражайся Язэфка, снаражайся сястрыца.
Там цябе дажыдаюць і касыцелы размыкаюць
і аўтары засьвіцілаюць,
Там цябе павенчаюць,
там табе ручкі звяжуць,
Там табе праўду скажуць

———,———

Для жаніха як выпраўляюць ехаць да нявесты.

За лесам, за лесам сонейка іграець
Ой рано, рано (прып.)
Там-жа Ванічка коніка сядлаець,
Слёзанька плачыць і цяжанька ўздыхаець,
Прышла мамуна ў яго пытаць:
– Чаго Ванічка, чаго дзіцятка,
Слезанька плачыш, цяжанька ўздыхаеш?
– Як мне не плакаць, як мне не ўздыхаць,
Бяру паненьку не к сабе раўненьку,
Ні к людзям прыстойна,
Ні к сямье прылежна
– Не плачь, Ванічка, не плачь дзіцятка
У нас пабудзець, такая будзець,
К людзям прыстанець, такая станіць

———,———,———

Запісаў С. Н. Сахараў 1 жніўня 1939 г. ад Гертруды Слядзейскай, 40 г., у в. Савеляны, Пасінскай вол., Лудзенск. пав.

# З вясельных песень

## Як адпраўляюць нявесту к жаніху

Кляновае лісьціненька, куды цябе ветры веюць,
Я і сама ня знаю, куды мяне вецер веіць,
Ці ў лог, ці ў балота, ці ў чыстае поле,
Ці ў сіняе мора?
Маладая Марыська,
Куды цябе мамка аддаецЬ,
Ці ў багатую хату,
Ці ў згодную сямейку?
Я і сама ня знаю,
Куды мяне мамка аддаецЬ.
Маладая Марыська,
Ці баішься ты сьвякроўкі?
Я сьвякроўкі ні баюся
На скамейкі паедцялюся
І раненька абачхнуся,
І сьлязой абліюся
І ручайкам абатруся

—, —, —

## Калі маладзенец (жаніх) у з'язжае на двор нявесты перад вянцом з сваей дружынай

Едзь на двор, адбей паклон (па 2 разы)
Старому малому да сырой зямлі,
Татухну з мамухной нізка ў ножухны
А ка мне маладой з правой ручанкай

—"—"—

Запісаў С. П. Сахараў 1 жніўня 1939 г.
ад Ганны Марчонак, 55 год, у в. Шушкава, Шкавенскай вол., Лудзенскага пав.

## З вясельных песень

А хто ў нас харошанькі, а хто ў нас прыго- малады
жаньк.
Гэй люлі, люлі, хто ў нас прыгожанькі?
Яначка хароша, Яначка прыгожа
Гэй, люлі, люлі Яначка прыгожа,
Ен у станьку ўходзіць, конік дуб'ю ходзіць,
Гэй, люлі, люлі конік дуб'ю ходзіць;
Ен коніка вывадзіць, конік з ім гаворыць,
Гэй, люлі, люлі, конік з ім гаворыць.
Ен коніка асядлаець, конік з ім маўлячіць,
Гэй, люлі, люлі конік з ім маўлячіць,
Ен на коніка садзіцца, конік вясяліцца,
Гэй, люлі, люлі, конік вясяліцца,
Ен полім едзіць, полі раздаюцца
Гэй, люлі, люлі, полі раздаюцца,
Ен лугам едзіць, лугі зіляненюцца
Гэй, люлі, люлі, лугі зіляненюцца,
Ен борам едзіць, зязюлі кукуюць,
Гэй, люлі, люлі, зязюлі кукуюць,
Ен каля саду едзіць, салаўі шчэбечуць
Гэй, люлі, люлі салаўі шчэбечуць,
Ен на двор ўз'іжжаіць, кветкі расцьвітаюць,
Гэй, люлі, люлі, кветкі расцьвітаюць;
Ен пад ганак пад'іжжаіць, Марылька спатыкаіць,
Гэй, люлі, люлі, Марылька спатыкаіць;
Здраствуй мой харошы, здраствуй мой прыго-
жы,
Гэй, люлі, люлі, мой прыгожы,
Даўно цібе ждала, даўно паджыдала
Гэй, люлі, люлі даўно паджыдала,

Даўно паджыдала, сталы засцілала,
Гэй люлі, люлі, сталы засцілала,
Сталы засцілала, крупкі намівала,
Гэй, люлі, люлі, крупкі намівала,
Крупкі намівала, Янічку вітала,
Гэй, люлі, люлі, Янічку вітала;
Белу пасцель слала, Янічку спаць клала,
Гэй, люлі, люлі, Янічку спаць клала,
Пасцеля шалкова, падушкі пуховы,
Гэй, люлі, люлі, падушкі пуховы.
Дзеванька высока, ні сцяны пасцель шырока,
Гэй люлі, люлі, пасцель шырока,
А сцяны вузенька, што-б спаць міленька.
Гэй люлі, люлі, што-б спаць міленька

——— .. ——— .. ———

Запісала матурыстка Дзвінскае дзяржаўнае беларускае гімназіі Антоніна Лукашэвіч ад Сіксто Урбановіч, 45 г., у в. Забінячкі, Букмуйжскай вол., Рэзекнескага пав., 12 чэрвеня 1939 г.

## З вясельных песень

Саколічык Ясеня, маладзец прыкраены,
По полю із жаіць, дзяўчыну шукаіць,
Паеду да хаткі, запытаюся ў маткі,
Ты мамулічка мая, дзе дочынька твая?
Пайшла на крыніцу, там чэрпаць вадзіцу.
А Яначка да крыніцы, там нямa дзявіцы.
Саколічык Ясеня, маладзец прыкраены
Па полю із жаіць, дзяўчыну шукаіць,
Паеду да хаткі, запытаюся ў маткі:
Ты матулічка мая, дзе дочынька твая?
Пайшла ў садочак шчыпаць цвяточак
А Яначка да садочка, там німа сьлядочка.
Саколічык Ясеня, маладзец прыкраены
Па полю із жаіць, дзяўчыну шукаіць.
Паеду да хаткі, запытаюся ў маткі:
Ты, матулічка мая, дзе дочынька твая?
Пайшла ў камору белу пасьцель слаць.
А Яначка ў камору, дзяўчына пасьцель
Сьцеліць шырока
Дзяўчынка вочська, ні сьцялі пасьцеля шырока,
Сьцялі вузінька, што-б спаць блюсенька

—, —, —

Запісала матурыстка Дзьвінскае дзяржаўнае беларускае гімназіі Антаніна Лукашэвіч ад Сіксціны Урбановіч, 45 г., у в. Забінішкі, Букмуйжскай (Вайводаўскай) вол., Рэзекнескага пав., 12 жніўня 1939 г.

# З вясельных песень

## Сваццi

Добра табе сваццынька ў міру сядзець,
Вінную чарачку ў руках дзяржаць,
Вінная чарычка ні скалыхнецца
Віно зялёно ні разальецца
Наша сваццынька ні разсьмяецца

—— " —— " ——

## Шаферу — надкосьніку

Наш Юзінька прышоў з поля
Забіў сароку пасярод току
Забіў цецеру сабе на вячеру,
Забіў дразда сярод гнязда,
Забіў стрэпачку, вераб'еву матку

—— " —— " ——

Вылятала шэра зязюля з бору.
За ей ззаду салавей ў пагон.
Пастой, паждзі шэра зязюля ты мяне,
Я абляцеў дзевяць бароў радзі цябе,
Ні нашоў такой зязюлі як цябе
Ды выхадзіла малада Анелька з касцелу,
За ей малады Янечка ў пагон
Пастой, паждзі малада Анелька мяне,
Ды я табе ўсю праўдачку скажу,
Ды я абчэздзіў дзевяць касцёлаў радзі цябе,
Нігдзе ні нашоў такой паненкі як цябе

—— " ——

Запісала матурыстка Дзвінскае дзяржаўнае беларускае гімназіі Антоніна Лукашэвіч ад Сіксты Урбановіч, 45 г., ў в. Забінякі, Букмуйжскай вол. Рэзекнескага павету, 12 жніўня 1939 г.

# З вясельных песень.

Вось учора звячора весялюсенька была,
А сягоння заплакала выпраўляючы дружка.
Не плач, дзяўчына не плач красна
Наплачаешся без мяне;
Прышлю табе падарунак, даражэй будзе мяне,
Як узложыш на галоўку, так успомніш пра мяне

Вось я чакала не дачакала
Заплакала і пайшла;
Яшчэ жальчэй заплакала
Як каля рэчанькі йшла
Пайду з гуры ў цёмныя лугі, у лістовенькі кусты
Ой сяду я маладзенька на зяленёнькай травуньцы,
Ой вы звяры, звяраняты сабірайцеся да мяне.
Разарвіце цела бела ва лістовенькім кусьце,
Занясіце сэрца маё бацьку, матухне маёй.
Няхай тужаць і бядуюць па няшчаснай сэрцэ

—— „ —— „ ——

Заляшчэла ляшчыначка па заходзе сонца,
Заплакала дзяўчыначка гледзячы ў ваконца.
Чаму мяне матуленька рана не будзіла?
Як першая кумпанія з места выходзіла
Твой друг ішоў напярэдзе, каб ты не тужыла.
Мне здаецца матуленька не тужу, не плачу,
А як выйду на вуліцу сьцежачкі не бачу;
Мне здаецца матуленька у тугу не ўдаюся,
А як выйду на вуліцу ад ветру валюся

—— „ —— „ ——

Запісаў быў вучань Дзьвінскае белар.
гімназіі А. Ёнін у в. Кулакішкі, Ку-
стынскай вол., 5 студзеня 1929 г

# Рожныя песьні

Ліцелі гусі із-пад белай Русі,
Селі яныя палі кад ціхім Дунаем.
А бадай тыя гусі як хмара прапалі,
Як мы любіліся мы бяды ні зналі,
Як мы любіліся нас гора ні знала,
А як разлюбіліся гора нас спаткала;
Як мы любіліся як ластаўкі ў стрэсе,
А як разлюбіліся як ягадкі ў лесе,
Як мы любіліся як галубкі ў пары
А як разлюбіліся як цемныя хмары

———.———.———

Ой паехаў Ясінька на Русь на вайну,
Да пакінуў Марысю адну ў даму,
А Марыся малада ўсю ночку ня спала,
Да Ясеньку лісточкі усе пісала,
А Яхева матуліка блізка дарогі
Усі тыя лісточкі пераняла,
Пераняўшы лісточкі перапісала,
Што Ясева Марыся двор спуставала
Вараныя конікі папрадавала,
Палавыя волікі папрапівала,
Дарагія суконкі на танцы дала.
Як прыехаў Ясінька з Русі, з вайны,
Да пашоў-жа Ясінька ў новую клець
Да пашоў-жа Ясінька раменаю плець,
Вось узяў-жа Марысі белы плечы сечь
Да стаў-жа Марысі — конікі стаяць
Пайшоў да стаенькі — конікі стаяць
Пайшоў ен да абор — волікі ня жаць
Пайшоў ен да камор — суконкі вісяць
Каб ня Ясена сонінька ня піў-бы вады,
Каб ня родна матуля ня біў-бы жаны,
А як Ясена сонетка засвяціла — напіўся вады
А як родна матуля нагавадзіла — набіўся жаны.

Запісаў матурыст дзвінскае белар. гімна-
зіі Станіслаў Рацан ад сваёй маці у в. Пуяна-
ні, Даўгаўп. пав. 17 VIII 1928 г.

# З вясельных песен

Баярочкі - спадманачкі
Вы мяне спадманулі,
Учора зьвячора вы мне казалі:
- Пойдзем у зялён сад вянкі віць
Сабе зьвілі з руты мяты, з лілей,
А мне зьвілі з калючага ялыніцу,
Ялынчік коліць, галоўку кволіць
Божа мой!

—— " —— " ——

Нету, нету нашай Данаські ў доме,
Пашла яна да Госпада Бога на раду,
Стаіць гадзінку, стаіць другую за дзьвярамі,
Як Бог у парог Данаська да ног
- Божа, Божа, прыдзі да мяне на вясельле
- Ідзі, ідзі млада Данаська да дому
А заўтра ранюсенька прыду,
А я сяду старшым сватам на куце,
Анёлы мае за брацішкоў для цябе
А я буду шчасьцям - далячай падзяліць,
Анёлы будуць да касьцёлу адпраўляць

Запісала вучаніца Кузьмінаўскай бел. школы Адэля Сарадыка, ад сваёй маці ў в. Аугулі Прыд. вол. 1927.

# З вясельных песен

## Нявесьце-сіраце

А знаці па піру, відаці па піру
Сіроцкае вясельле.
У двор нязмяцін, і пір ня весел
Сіроцкае вясельле
Сталы засланы госьці сакліканы
Парадачку нету
Каму загадаці, каго-бы пасылаці
Па родную матку.
— А ты Ганначка, а ты дзяванька
Ты пашлі сакаліка
Ён высока лятаіць, да зямлі пры-
падаіць
Мамаську прабуджаіць.
— Устань, мамаська, ўстань родная
Багаславі дачушку сваю.
— Ой рада-бы ўстаці, свайму дзіцяці
Парадаську даці
Сырая зямля на грудзі залягла
Ні магу прадыхнуці,
Жоўты пясочкі засыпалі вочкі
Ні магу праглянуці,
Зялёны цвяточкі сьціснулі плечкі
Ні магу пакрануці,
Дубовыя дошкі сьціснулі ножкі
Ні магу ўстаці
Ні магу ўстаці к свайму дзі-
цяці
Багаславенства даці!

---

Запісаў бел. вучыцель Мікола Талерка ад Марыны Сардыко 60 г. у 1927 г. у в. Азерцы II Савянец, прыд. вол., Дзвін. пав.

# З вясельных песень

Сядзіць зайка пад ёлкаю — вочкі трэць
Едзіць сучанька к цесьцюшку яго б'ець
— За што, за што, млода сучанька, мяне б'еш
Ці я табе дарожаньку перабіў,
Ці я табе варанога коніка распудзіў,
Ці я табе млоду дзеваньку адводзіў?
Перабілі дарожку шэры ваўкі,
Распудзілі варанога коніка,
Адлудзілі табе дзеваньку [illegible],
Яны чудзілі сабе хацелі, ды ніхто [illegible]

— . —

З'ездзіў я коніка, з'ездзіў варанога
Любіў я дзяўчыну твару румянога
Сказаў дзяўчыне праўду мне
Альбо любіш, альбо не?
Я табе казала, што мне з табою не будзе сходу
У мяне пакору не будзе
Возьмуць мяне добры людзі
— Ты ў мяне пасаг сама
Як ў небе ясная зара
— Цяпер ты казала, як ясна зара
Потым ты сказала — нячысцікам
Хоць не ты сказала, твая маці доня
На што бедную было браці
— Няў вазьмі дзяўчына, што маці
Пойдзем да кавальцоў кайдаз рукі кавальцы
Кайдаз рукі звязаць звязаныя
А мы будзем жыць с табою

Запісаў — Бел. сучасн. Мікола Ткачэнка ад маці Агрыпіны [illegible] 60 год, у 1924 г. у в. Азерцы [illegible] II Савецк. раёна, Гом. вол., Бел. ССР

# З вясельных песень

Зборная субота настала —
Ганулька — дзяўчат зьбірала,
Сабраўшы ў радочак сажала,
Сама села маладая вышэй усіх,
Склоніла галоўку ніжэй другіх:
— Дабранач, дзяўчаткі, дабранач
Не на адну ночку, на ўвесь век.

Суботачка нядзельку дачакала —
Маладая Марыська свайго татачку шукала
У магільнічак чорнаю сьцежку зьбіла
Ды свайго роднага татку будзіла:
— Устань, устань, родны татулька, не ляжы
Хоць гэтаю ночку мне памажы!
— Ой не магу, моё дзіцятка, не магу,
Збудавалі мне сталяры сьвятліцу,
Ня вокнаў ні дзьвярэй, ні ваконца,
Каб я ня бачыў праменца сонца,
Каб ня відзеў свайго дзіцяці вясельля.

Дзякавала белая бярозка дубраўцы,
— Дзякую, мая дубраўца, за тое
За тваё пастаяньнічка ціхае
Што я за табой бурь, ветру ня знала
Што я за табой дробнага дожджу ня дбала.

Дзякавала маладая Анелька матульцы:
— Дзякую табе, матулька, за тае,
Ды за тваё гадаваньня лягкое
Я ў цябе гора, бяды ня знала
Я ў цябе на кірмашах гуляла.

Запісаў матурыет Дзьвінск.
бел. гімназіі Станіслаў Гацьвін
ад сваей маці, ў в. Пустыні
Дзьвінск. пав. 17 VIII 1928 г.

# З вясельных песень

Ходзіць, паходзіць мил месяц па небе
Лічыць, палічыць дробныя зьвёзды па небі,
Не далічыць адной зьвёздачкі.
З зарыцай пашла яснаму сонцу служыць
Ні на дзянёчак, ні на гадочак,
на ўвесь век!
Ходзіць, паходзіць родны татулька па двары
Лічыць, палічыць цэю сямейку,
Не далічваіць адной дзіцяці ў доме. ў домі
Пашло дзіцяця татку чужому служыці,
Ні на дзянёчак, ні на гадочак
на ўвесь век!

— " —

Ехаў сужанька цераз цёмны лес
Вымагаў, выразаў тры розачкі,
Сьцібануў коніка пад ножкі:
— Бяжы, конь, к цесьцюшку ў двор
Стукні капыткамі ў вароцікі
Каб сталі вароцікі пасярод двора,
Каб выйшаў-бы цесьцюшка,
Каб выйшла дзеванька мяне ўзнаваць
мяне пераймаць

— " —

## Нявеста галосіць

Родная мая матулька
Я-ж цяпер табе ні работніца,
Пайду к чужой матухне
працаваць,
Чужой матухне угажаць.

Запісаў бел. вучыцель Мікола Талерко, ад Марыны Азеркай, 60 год у 1924 г., у в. Азерцы — II Совецц, прыд. вол. Дайгав. пав.

 

## Сіроцкая

Хата багата, расход вялікі,
Ды парадаваць каму:
Хоць вялікі двор, ды няцьвел прыбор,
Калі татулькі няма.
Ты дзеванька малада, пашлі салаўя,
Салавейка-рызва пташанька,
Ён скора зьлітаець.
- Салавейка — рызва пташанька
Зьлітаў па татку.
Салавей літаець к зямлі прылягаець,
І татульку ўзбуджаець:
- Устань, татулька, устань, родны,
Устань, ні ляжы!
Хоць адну ночку мне памажы!
- Рад-бы ўстаці, дзіцяці парадачак даці,
Ды не магу ўстаці:
Дубовы дошкі сьціснулі ножкі,
Не магу падыйсьці,
Зялёныя цьвячкі забілі плечкі,
Не магу павярнуцці;
Жоўты пясочак засыпаў вочкі,
Не магу праглядзіцці,
Сырая зямля на грудзі ўзьлягла
Не магу прадыхнуцці;
Трайкай, мурайкай зарасьлі дзьверцы,
Не магу адчыніцці —
Бакі замочак замкнуў рапачак —
Не магу прамовіцца.
З Богам, дзетка, з Богам родная —
Бог на раду, бліжнія ўсядзі на параду.

Запісала Адэля Сапоцька
ад сваёй маці, у в. Аўтюкі,
прыд. вол., у восені 1927 г.

# З вясельных песень

## Сіроцкая

Цераз гору чорна сьцежка ўбіта
Там Анечка хадзіла, сваю матульку будзіла:
- Устань, устань, мая матулянька ні ляжы,
Хоць-жа ты мне гэту ночку памажы
- Рада-б устаці, сваей дзіцятцы парадачак даці — ні магу
Рада-б устаці на сваё дзіцятка паглядзець
Як яна прыбрана, як яна пасажана?
- Прыбрана паненачкаю, пасажана прыгожа
Мая галоўка у цвеце, ням маей маткі на свеце
Мая галоўка ў вяночку, ням маей маткі ў радочку
Мая матулька ў далі далёкай
У зямлі глыбокай там ляжыць.

---

Дзякавала бела бяроза дубраве:
- Дзякую табе, дубрава, за тое
За тваё добрае стаяньне,
Ні было на мне дробнага дожджыку,
Ні было на мне буйнага ветру!
Дзякавала малада Анечка матульцы
- Дзякую табе, матулька, за тое,
За тваё добрае гадаваньне;
Ні было на мне ні цяжкой работкі
Ні было на мне ні [illegible] абмоўкі
Як я стала ў свякаркі, ў свякроўкі
Адкуль тая цяжкая работка
Адкуль тая [illegible] абмоўка ўзялася

Запісала Марыля Барысёнак ад сваей маці, у в. Бартнікі, прыд. вол., у восені 1927.

## Хаўтурныя песьні

### Як дачка галосіць па памёршай матцы.

Мая маманька, радзіцелка,
А куды-ж ты адлятаеш,
На каго-ж ты нас пакідаеш,
А скажы-ж ты нам вернае слоўца,
З якой старонкі нам цябе перажмаць,
Ці з тэй старонкі, гдзе ясна сонца ўсходзіць,
А ці з тэй, гдзе ясна сьонца заходзіць,
У якое нам вакошка пачлядаць,
Калі цябе перажмаць,
Ці ў суботу позна, ці ў нядзельку рана,
Да каго-ж мы цяпер прыхінімся
Зацямнелі ўсе нашы куточкі і віднаі
вакошкі,
Як адлетаіць наша маманька-радзіцелка,
Ні ад каго-ж мы не пачуем добрага слоўца.
Ні з якой старонкі не павеюць на нас цёплыя
вятры,
Ні ад каго-ж нам ня будзе
Ні абароны, ні жаласьці,
Мая маманька-радзіцелка
Зарастуць сьцежкі-дарожкі
Дубнякоя, бярэзнікам,
Маладым алешнікам

---

Запісаў 1 жніўня 1939 г. С. И. Сахарэвіч у в. Шушкова, Шкавенскай вол., Лудзенскага пав., ад Вікторыі Дамчонак, 80 год.

## Як беларусы памінаюць нябошчыкоў

20 ліпеня 1939 г. мне прышлося быць на кірмашу ў с. Ляўдэр, Лідзенскага павету, у дзень св. прарока Ільлі. Каля царквы размясьцілася нішчых братія, якія ня толькі просюць міластыню, але памінаюць нябошчыкаў (памершых) і за гэта атрымоўваюць хлеб, ябк. грошы.

Вось падыходзіць набожная жанчына к адной старушке-нішчэнке і кажа „памяні бабка маіх!", назвала па чарзе імёны сваіх памершых родзічаў і знаёмых. За кожным імем нішчэнка каже „Памяні Госпадзі Матрэну, Сцяпанову . . . і ў душачку во царстві нябеснім". Пераличыў імёны ўсіх, жанчына кажа: „Ну, годзе, іх усіх успомніш, памаліся за ўсіх".

І тады нішчанка кажа заўвернаную такую формулу:

„Помяні Госпадзі дзядоў і прадзедаў,
Бабкаў і прабабкаў, унукаў і праўнакаў,
Сьвёкраў і сьвякровак, дзевяроў і ятровак (ятроўка-нявестка)
братоў і сестраў і мілых дзетак,
Цясцёў і цешчаў, швагроў і швагерак,
Сваякоў і сваячаніц, кумоў і кумушак
Хрэсьнікаў і хрэсніц,
Хрэсных татак, хрэсных мамак,
Каторыя к хрэсту паднаслі.
Ад Бога шчасьця прасілі,
У хрысціянскую веру ўвадзілі.
Памяні Госпадзі, да пары неданошанных,
Каторыя хрыста не даждалі, сьвятых таін ня прынялі,
У царквы не успаміналі,
Памяні Госпадзі, на полі брані убіенных,
Грозой забітых, на агне гарашчых,
На вадзе патапляшчых, паўсюды лежачых,
Усе душачкі Госпадзі памяні во царстві тваім,
И праесці ім грахі вольныя і нявольныя".

Запісаў С. П. Сахараў 2 кастрычніка 1939 г. (20 ліпеня па ст. ст.) ад аднэй нішчанкі пры Ляўдэрскай царкве.

## 3. Сямейна-бытавыя песні

### Доля дзяўчыны

Ляцелі гусі цераз тры полі
Зязюля ўперад,
Ішлі дзевачкі цераз сенечкі
А маладая ўперад.
Дзеванькі селі, песенькі запелі,
А маладая заплакала:
Ах божа ж мой божа, якая мая доля,
З кім я жыла, уцешалася,
З тым растаюся,
З кага кпіла, сьміялася,
Таму дасталася.

—— " ——

Што найлепшаму дзераўцу бог лісту ні даў,
Што найлепшай дзяўцы бог долі ні даў:
Аддаў татка Люкадку замуж далёка,
Прыказаў татка Люкадкі ў госці ні хадзіць;
Мужыла гадок, прамужыла другі,
А на трэці гадок думу ўздумала-
Папрашу я ў салаўя добрых крылышак,
Папрашу я ў зязюлі звонкага голасу,
Палячу я к татульку ў зялёны сад,
Пакукую маладая звонка жалаена,
Ці пачуіць татулька па сянех хадзя,
Ці пачуіць матулька абед вара,
Ці пачуіць братулька па стайні хадзя?
Ні пачуў мой татулька па саду хадзя,
Ні пачула мая матулька абед вара,
Ды пачуў мой братулька па стайні хадзя.
– Калі шэра зязюля ляціць у шчэры бор,
"Калі наша сястрыца ляціць к нам на двор."
Гдзе Люкадка мужыла – сучкі сушыла,
Гдзе Люкадка плакала – лугі тапіла

—— " ——

Запісала вучаніца Дзьвінскае дзярж. белар. гімназіі Антоніна Лукашэвіч у в. Біраны, Букмуйнеская вол. Рэжыцкага пав., ад Фядоры Залман, 8 ноября 1934 г.

# З сямейна-бытавых песень

## Доля дзяўчыны

Елушка, елушка, што ні зелена стаішь,
Ха, ха, ой, хаха, што ні зеліна стоішь,
Ды як жа мне зялянюсінькай быць, ха, ха
З пад карэння елушкі быстра рэчанька бя-
жыць, ха, ха
По вярху елушкі быстры пташынькі клююць, ха, ха
Дзевіца, дзевіца, што ні весела сядзішь? ха, ха
Як жа мне вясялюсінькай быць, ха, ха
Спалюбіла восі такога, што ні маіць нічога, ха, ха
Толькі люльку ды цыбук,
А сам ходзіць як кадук*, ха, ха
Чорна шляпа на баку, заставлена у кабаку, ха, ха
Сам гарбаты і жанівеўся як багаты, ха, ха

*) Кадук — злой дух, чорт

— " —

Ці ні пчолка высока ляцела,
А звонка звінела,
Да ні пчолка зазвінела,
Мішкава слова загрымела,
Да Бог мне даў жану маладую,
Сямейку вясёлую,
Куды пайдуць работанку зробюць
І самі весяляцца

— " — " —

## Гумарыстычная

Ты, Адамка, ні хварсі, ні свае ў цябе часы,
Адна цапка на грудзі і тая занята ў людзі,
У цябе часікі суседнія, а сапожкі паследнія,
Адна вадзіца на стале, нет коніка на двары
Нет у карчушкі ў хляве,
Ты, Адамка, ні хварсі і ласкуткамі ні трасі

— " — " —

Запісала матурыстка Дзвінскае дзярж. белар. гім-назіі Антаніна Лукашэвіч ад Федоры Залман у в. Б. Граси, Букледскай (Вайвадоцкая вол.) Рэзекнескага пав. 8 кастр. 1939 г

За лесам, лесам, за лесам лесам
Трава зялена, трава зялена,
За добрым мужам, за добрым мужам,
Жана вясела, жана вясела,
На ніўку ідзець, на ніўку ідзець,
Ніўку зьвілічаць, ніўку зьвілічаць,
Каб гэта ніўка, каб гэта ніўка
Дай пашырэла, дай пашырэла,
А я маладая, а я маладая,
Дай памаладзела, дай памаладзела

За лесам, лесам, за лесам лесам
Трава павяла, трава павяла,
За дрэнным мужам, за дрэнным мужам,
Жана прапала, жана прапала
Ідзець на ніўку, ідзець на ніўку,
Ніўку праклінае, ніўку праклінае
Каб гэта ніўка, каб гэта ніўка
Вузка, дый павузела

— " —

Запісаў беларускі вучыцель Мікола Талерка ад Марыі Азерскай 60 г. у весцы Азерцы, улетку 1927.

## Доля дзяўчына

Ай восень, восень
Сватов па восем,
А ка мне ні воднага
Каб яны прыбілися
Пра мяне забылися,
Каб яны пагінулі,
Як мяне пакінулі,
Я гора набралася
У поля нагнялася.
Сабак наманілася
І маладцоў надражнілася,
А ужо і замуж хочацца.

---

Ах мамонька мая, я ўжо ні твая,
А таго ўжо я пана, з кім шлюб шлюбавала,
На каўры стаяла, Богу прысягала
А нам бацюшка рукі звязаў стулою
А нам век жыці з табою.

---

Запісаў беларускі вучацель Мікола Таляркo ад Марыі Азеранай, 60 г., у в. Азерцы, Прыдруйскай вол., Даўгаўпілскага пав., улетку 1927 г.

# Рожныя песні

## Доля дзяўчыны

(сьпяваецца перад Загавенамі на масляную).

Ой зара наша вячорная
Вышэй лесу падымалася,
Вышэй лесу, вышэй цёмнага
Вышэй садзіку зялёнага,
У тым саду дзеўка мылася,
Яна мылася, умывалася,
Сваей красой дзівавалася:
-Ой краса мая, краса,
Каму ты застанешся,
Ці старому, ці малому,
Ці малайцу удалому,
Калі старому застанешься
Краса мая начаруешся,
Калі малому застанешся
Краса мая набаздзячешся.
Калі малайцу застанешся
Краса мая накрасуешся.

---

Запісаў С. П. Сахараў 1 кніжніц
1939 г. ад Вікторыі Дамчонак, 80 г.,
у в. Шчушкава, Шкавенскай вол.,
Лудзенскага пав.

## Рожныя песні

### Доля дзяўчыны

Зайшло сонца за ваконца
Ды за зелен сад,
Брала парня за ручаньку
Ды павяла ў сад,
Пасцялiла пасцель белу,
Палажыла спаць,
Сама села ў край пасцелі,
Зажурылася, што за маладым
Казачэнькам палюбiлася.
— Ня журыся дзяўчынёнька
Ты будзешь мая,
Ёсць у мяне бочка піва,
А другая — віна,
Ёсць у мяне калясачка пазалочана,
Ды к етай калясачкі конік вараной,
Мы сядзем і паедзем к цёшчы дарагой.
Здарова цешча, здарова дарагая,
Ці аддаеі ты цешча дочку замуж
За мяне.

— „ —

Запісаў С. П. Сахараў 29 ліпеня 1939 г. ад Гертруды Сядзецкай, 40 г., у в. Саветнікі, Пасянкай вол., Лудзенскага пав.

# Рожныя песьні

Маці сына расьціла
Выраасьціўшы не жаніла,
Паехаў сынку сам жаніцца,
Яго маці ночь ня спала,
Горкую атраву гатавала,
Для сына свайго - зялёно віно
Для нявестачкі - горкую атруту.
Прыехаў сын ажаніўшыся,
А яго маці выйшла вітаць,
У правой руцэ - зялёно віно,
У левай руцэ - горкая атрута;
А сын узнаў, віна ня піў,
На каня узліў,
А горкую атруту папалам піл.
- Ой, маці, маці ня умела вітаць
Умей-жа маці нас пахаваць:
Мяне пахавай для царковачкі,
Жану маю каля боку майго.
А маці яго не паслухала
Схавала сына каля царковачкі,
А жану яго за царкоўкай,
На сыне вырос зялёны явар,
А на нявесткі бела бяроза;
Яны расьлі, сарасталіся,
У места макоўкі зьвіваліся,
Шырокае лісьце у места сьліпаліся.
Ехалі там князі баяры

Яна ехала дзівавалася,
Ды хто тут схаван,
Ці брат с сястрой,
Ці муж з жаной?
Калі брат з сястрой —
па крыві сваей,
Калі муж з жаной -
У згодзе жылі
А маці яго дазналася,
Узяла сякеру, пайшла, зрубіла
Зялены явор на звонкі гуслі,
Белу бярозу на жаркі агонь,
А вось табе нявестачка
Каржыні вон.

——— " ——— " ———

Запісаў С. П. Сахараў 31 ліпеня 1939 г. ад Міхаліны Богдан (па бацьку Дамчонак), 47 г., у в. Шушкава, Шкавенскай вол., Лудзенскага пав.

# Рожныя песьні

А ў нядзельку з паранельку,
Маладая Марусенька сына радзіла,
Парадзіўшы, сынуленьку чыста памыла,
А памыўшы сынуленьку ў Дунай панесла.
— Няма ў цябе Дунайчык ні дна, ні канца,
Як у майго сынуленькі ні маткі, ні айца!
Як учулі два малойцы коні пасючы,
Як узялі Марусеньку за ценкі бакі,
Ды ўкінулі Марусеньку ў Дунай глыбок,
Ды як стала Марусенька на дно панураць,
Ды стала Марусенька мамку успамінаць,
Ёсьць у цябе мая мамка, яшчэ цэлых пяць дачок,
Ні пускай-жа іх па вуліцах, нікай дома сядзяць
— „ — „ —

Пад дубам, дубам ячмень малачу, (па 2 разы)
Вышэ дубочка саломка ляціць,
Гляну я, гляну на ціх дунайчык,
У ціхім дунаечку чаўночак плывець,
А ў тым чаўночку бел малойц сядзіць.
Чэшыць кудзерцы частым грэбяшком.
Кідаець кудзерцы на ціх Дунайчык.
— Плывіце кудзерцы к таму беражку,
Дзе мая жонушка ваду брэдзь,
Пытайцеся ў яе, ці тужыць па мне?
— Няхай па ім тужаць камень ды вада,
Я ня буду тужыць, бо я молода,
Часаў ён трэскі з маіх белых плеч
Віў ён вяроўкі з маіх русых кос.
Пускаў ён рэчкі з маіх дробных сьлёз
— „ — „ —

Запісаў матурыст Дзьвінскае дзярж. белар. гімназіі Зенон Чэкель 25 снежаня 1927 г. ад сваёй маці ў в. Юраны, Пустынскай вол., Дзьвінскага пав.

# Рожныя песьні

Пайду, пайду па тых сьцежачках! } па 2 разы
Дзе я здаўна хадзіла
Ці ня ўвіжу я, ці ня ўбачу я,
Каго верна любіла.
Ды хоць ні яго, ды хоць ні яго,
Хоць таварыша яго,
Распытаюся, разгукаюся
аб жыцьцейку яго
Ды як ён жывець, ды як ён жывець,
А я малада гарую,
Ды без дроў, без дроў, без лучыначкі
Цёмну ночку начую,
Ды пайду, пайду ў бярэзьнічак
І лучыначак нашчапаю,
Ды пайду, пайду ў сасьнічак
І дроў цэлу нарубаю

— " — " —

Адна гара высока, а другая нізка,
Адна мілая далёка, а другая блізка,
О я тую блізенькую людзям падарую,
А да маей далёкай пяшэчкам павандрую.
Два голубі ваду пілі, а два калацілі,
Бадай тыя век канали, што нас разлучылі,
Сівы голуб, сівы, а галубка светла,
Мілы бацька, міла мамка, дзяўчына мілейша,
Кахалися, любілися, потым перасталі,
І ў канцы разышліся як цёмныя хмары

— " — " —

Зап. матурыст Дзьвінскае дзярж. белар гімназіі Зенон Гжэль у в. Юрана, Пустын. вол., Дзьвінскага пав. ад свае мат.
25 сьнежаня 1928 г.

## Песьня пастушка.

Ня будзіце мяне рана,
пакуль сонейка узыйдзець,
А раса на зямлю спадзець,
Пастух выйдзець на лужок
І затрубіць у разжок:
-Выганяйце вы скаціну
на шырокую даліну.
Гонюць бабы, гонюць дзеўкі,
Гонюць малыя рэбяты,
Яшчэ гонюць старыкі, міраеды мужыкі,
Яшчэ гонюць старушкі, міраедавы жанушкі,
адна дзеўка весяла,
уваккруг гуляць пайшла,
Яна скачыць, рукой машыць,
Пастушка к сабе завець:
-Хадзі, хадзі пастушок,
Хадзі міленькі друкок!
Адну ночку начавау і каровку пацярау,
Другую начавау і усю стаду пацярау

— " — " —

Запісау с П. Сахараў 31 ліпэня 1939 г. ад Міхаліны Бодзан (па бацьку Дамчонак), 47 год, у в. Шушкава, Шкавенскага вол., Лудзенскага пав.

# Рожныя песьні

## Песьня чумака

- Малады чумак аб чым зажурыўся,
Ці волы прыстал, ці з дарожкі збіўся?
- Волы ня прыстал, з дарожкі ня зьбіўся,
Таго зажурыўся, што бяз долі ўрадзіўся;
Пайду ў чыста поле шукаць сабе долю,
Ні знайшоў я долі, знайшоў рыбалоўцаў;
Рыбалоўцы-хлопцы, удалыя малойцы,
Вы закіньце сеці чераз быстру рэчку,
Вы паймайце долю хлопцу маладому.
Рыбалоўцы-хлопцы, удалыя-малойцы
Закінулі сетку цераз быстру рэчку,
Ні паймалі долі хлопцу маладому,
А паймалі рыбу-шчуку,
Рыба-шчука злая сеці разорвала,
Пайду я ў карчомку пьяненькі напьюся
І пайшоў ў карчомку пьяненькі напіўся,
З карчомкі выйшаў на тын нахіліўся
На тын нахіліўся, чуць не паваліўся
І малады малойчык узноў зажурыўся

—" —" —

Запісаў С. П. Сахараў 31 ліпня 1939 г. ад Міхаіла Багдан, 47 г у в. Шушкава, Шкавенскай вол. Лудзенскага пав.

# Рожныя песьні

(восеньскія, бяседныя)

У бару баравічкі, дзеўкі брали журавінкі,
Там Ванюшчынька касіў, журавінак папрасіў.
Ах, ты Ваня бел кудраўчык,
Ты паеватай-ка мяне, пушчу
ты паеватаешь-ні пайду, ты прыедзішь-ні

— " — " —

Да хто там хадзіў, блудзіў?
Юзінька хадзіў, блудзіў, чорную сьцяжку ўбіў
Да Анцінькі хадзючы, падарачкі насючы,
Стук, стук у вакошычка, ты Анцінька крошычка,
-адчыні вакошычка, прайми падарычкі
Мяккія бараночкі, салодкія прайнічкі,
сахарныя яблачкі,
Дзе-ж тая бутылица у сянех пад лавіцаю?
Зарасла муравіцаю, муравіцу касіця будзешь
Гарэлачку піць будзешь
Анцінку жаніць будзешь.

— " —

Бару, па бару, па верасу
раненька, раненька! (прып.)
Ляжыць бруса чэсана,
На тым што на брусу,
Ходзіць малады Казінька,
За ім ззаду малада Паўлінка.
-Ты пастой, ты паждзі ты мяне,
Я цябе усю праўду скажу.
Кам-ж чата сіні вазеры замерзлі?
-Праўда, Праўда Паўлінка ўсіх пытаў
Ды я там быў, лядочак прабіў
Коніка пану ўпаню, раненька, раненька!

— " —

Записала матурыстка Дзьвінскае дзярж. белар. гімназіі Антаніна Лукашэвіч 9 кастрычніка 1939 г. у в. Мураванка, Букшынскай вол. Рэзекнескага пав., ад Гелены Лімяшонак, 70 г.

# Рожныя песьні

Стаяў явар над ракой, на ваду хіліўся,
Цікла рэчка з-пад мястэчка, з вішнёвага саду.
Ехаў казак з Украіны сьлязою абліваўся.
- Ты стой явар ня хіліся, яшчэ зялёненькі,
Ты пастой казак ні жаніся, яшчэ маладзенькі.
Хадзіў казак да дзяўчынкі, на вялікую раду -
Парай, парай дзяўчынька, як родная маці:
- Я табе казачэньку раю і ні раю
Адзін вечар з табой стаю, а другого маю
- Багдай ты дзяўчынка прапала б
Як мне казачэньку чванна адказала.
Як у млыну на каменяно пшанічэнька узышла.
Багдай-бы дзяўчынка тады замуж пайшла,
- Як у лесі ля верасу пугаль урадзіўся,
Багдай-бо казачэньку ты тады жаніўся.

———,———

Запісала матурыстка Дзьвінскае дзярж. белар. гімназіі Антаніна Лукашэвіч 9 жніўня 1939 г. у в. Муравянка Букштынскай вол. Рэзек[?] Невакага пав. ад Гелены Лімічонак, 70 г.

# Рожныя песьні

Лучына лучынушка,
Не ясна гарыш,
Ды што-ж ты, лучынушка,
У печы ні была.
Ліхой сьвекар-бацюшка
Сьнегу налажыў,
Ліхая сьвякровушка
Вады падліла

— " — " —

Як на горкі, на гары
Тры сады зеляны:
У першым садзе — вінаградзе
Расла трава рожа,
Любіць мяне друг-сярдэшны
Хош я ні прыгожа;
У другім садзе-вінаградзе
Расла трава-мята,
Любіць мяне друг сярдэшны,
Хош я ні багата,
У трэцім садзе — вінаградзе
Расла трава-ліпа,
Любіць мяне друг сярдэшны
Хош я невяліка.

— " —

Запісаў матурыст Лудзенскае беларускае гімназіі Антон Лейтан у летку 1930 у Лядскаронічына (шкавенская вол.) Лудзенскага пав.

# Розныя песьні

## З любоўным матывам

Як на горку сьнег напаў
Мой мілёнак з каня спаў,
Ён упаў і ляжыць,
Пакуль міла прыбяжыць,
А міла прыбяжала
За ручанку ўтрымала.
Ты вядзі каня к Катрына,
Прыходзь ка мне ў пярына,
А ў пярына мягка, мягка
Цалавацца сладка, сладка
А з пярына пух вон,
А міламу дух вон.

— " — " —

Запісаў матурыст Лудзенскае беларускае гімназіі Антон Лебтан у летку 1930 г., у Лятоскароншчана (Шкавенская вол.), Лудзенскага пав.

# Апавяданне

Агатьі Невярбдскай „з сваей галавы"
г. е. уласны яе твор

Як у маяго бацькі былі тры родныя дзядзькі,
Адзін быў Тумаш, а други быў Ананас,
А трэцці быў Лявон.
Дзядзька Тумаш паехаў у Асвею на кірмаш,
Быў вялікі мароз, ён там змёрз,
Яго там добра пахавалі,
але нам ведама не далі;
А дзядзька Ананас нікалі не хадзіў да нас,
Толькі нашага папу ні квас,
Трымушаў яго хадзіць да нас,
Як квас піў, добра з бацькай гаварыў,
Як квасу напіўся з бацькай пабіўся;
Матка на бацьку стала казаць:
Нада на яго ў суд падаць
А бацька кажа: Эх, я ні з кім ня біўся, ні ругаўся,
Баюся, каб у пэкла ні папаўся.
Гэты дзядзька Ананас
Прапаў без вясьцей ад нас,
У яго добрая прыцяжыка –
На нас барадаўка з гусінае ябко
Цяпер дзядзька Лявон быў,
не здароў быў: мала на гэтым свеце жыў,
Ён слонцу і ветра баяўся
У цёмны куток хаваўся

Гэта была дзела ў тракарнае время.
У суботу выправіла нас матка на работу
- Ідзеце, дачушкі, да абеда папрацуйце,
Пасьля абеда адпачнеце
Прышлі мы на абед
- Дачушкі, негде сесьць і нечага вам даць есьці,
Цяпер ідзеце да вечара папрацуйце,
А ў вечару будзе капуста з мёдам
Адроду ня еўшы мёду, пашлі ахвотна на работу,
Ідзём у вечару дамоў; чуем крык, гвалт, енк;*)
Начам крайней ляцець, думам бацька матку б'ець,
Прыходзім дамоў, матка плачыць.
Вось, дзеткі, некаму ў куточку сядзець,
Не на кога вам будзе глядзець.
Бацька гаварыць: ну, што, дзеці,
Некалі вам плакаць,
Нада ісьці да суседзяў пазычыць дасок.
На мяне, як я старэйшая дачка, бацька кажыць:
- Ідзі, мая дачка, да суседзяў пазыч!
- Што там зря ісьці,
І пазычам, і брам, і ніколі не аддам,
Хто там нада даесьць.
Тады матка дагадалася:
- Ай, дзеткі, ня турбуйцеся, дзякуй богу, багата жывем,
Пяты год як хлеба не пячом,
Дзежачка стаіць, мышы выгрызлі як выгадліўшы!
Дзядзьку ў дзежку пасадзілі
Вечкам накрылі і хараша пахавалі

Запісаў С. П. Сахараў 12 ліпеня 1928 г.
ад Агаты Неўяроўскай, 66 г., крп.
ст. Індра.

# Родныя песні

## Жаўнерская

Гасла трава шырока
Цякла рэчка глыбока
У той траве казак ляжыць
Над ім конік стаіць
- Ня стой конь над мною,
Над маёю галавою,
Бяжы, коня, дарожкаю,
Бяжы, коня, шырокаю,
Зазвоні, коня, капытком,
Заржы, коня, галоском
Там выйдзе стара бабка.
Стара бабка, то мая матка,
Яна будзіць у цябе пытаць,
Умей, коня, як адказаць.
- Коня мой, варанеенькі
Гдзе-ж мой сынок маладзенькі,
Ці ты яго ў бары згубіў
Ці ты яго на вайне забіў?
- Ні я яго ў бары згубіў
Ні я яго на вайне забіў,
Вазьмі, матка, пяску жменьку
Пасей на каменьку,
Калі, матка, пясочак узойдзе,
Тады, матка, сынок прыйдзе.

---

Запісала вучаніца Кузьмінскай бел. школы Адэлія Сарочка ад сваей маці, у в. Аўцюкі, Крэф. вол., у восені 1927.

# Родныя песьні

У месяцы тры ражочкі крутыя,
А ў Антона два брацікі родныя.
Адзін брацітка варанога каня сідла —
Други брацітка яго маладога навучаіць;
— Як паедзіш, мой брацітка, ў новы двор —
Табе пасадзюць трох дзевачак на выбар,
Адну пасадзюць у золаце прыбраную,
Другую пасадзюць у серабры прыбраную,
А трэцяю пасадзюць у беленькім прыбраню
Ні бяры тую, дзе ў золаце
Ні бяры тую, дзе ў серабры
А бяры тую, дзе ў беленькім прыбраня
Мы на яе самі золата ўсклодзём,
А розуму ні ўкладзём.

———

Едзь паедзь Антонка ні станавіся
Ні станаві коніка пад рабінаю,
Рабіна дзераўца ні шчасьлівая,
З вяршыні рабіну пташкі клююць,
З сірадзіны рабіну чэрві точуць,
А з карання рабіны воды цякуць.
Едзь, паедзь Антонка астанавіся
Астанаві коніка пад ягорага
Ягора дзераўца шчасьлівая
На вяршыні ягоры салаўі пяюць,
З сірадзіны-рай ідуць
З карання ягоры мяды цякуць

——„——

Запісала Марыля Барысёнак
ад сваей маці, ў в. Бартулі,
Рыгаруйск. вол., ў восень
1927 г.

# Розныя песьні

Затужыла салаўйева пташанька:
— Куды, куды, салавейка паляціш?
— Палячу я цераз два сады ў трэці
Там мяне ці пташанькі любілі
На каліну, на маліну садзілі,
Салодкімі ягадкамі карміілі
Крынічнай вадзіцай паілі
Затужылася Антонова матулька:
Ды куды-ж ты малады Антоні паедзіш
— Паеду я цераз два двары у трэці?
Ды там мяне ці дзеванькі любілі
За цясовыя сталікі садзілі,
Сахарнымі стравамі карміілі
Салодкімі напіткамі паілі
На выезджаныя моладу Ганначку дарылі.

— " —

## Талочная

Дубам пад дубам гарох малату
Вышэй таго дуба саломка ляцець
З пад таго дуба рэчка бяжыць
А ў той рэчанцы белы маладзец
Ён кудры чэшыць частым грабячком
Кідаюць ачоскі на ціхі Дунай,
— Плывіце, ачоскі, к таму біражку,
Дзе мая жонушка ваду бярэць?
Ці пазнаеце мяне маладца?
— Нехай жалеюць цябе камяні,
А ні я буду жалець ды вада малада.

Запісала Марыя Барысёнак
ад сваей маці, ў в. Бартулі,
Крыўч. вол. у 1927 г.

# Розныя песьні

А ў полі вазёрца — там стаяла вядзёрца,
А там казачэнька коніка паіў, ён сам ута-пўся
Каля рэчанькі дзяўчына ходзіць, белы ру-чанькі ломіць,
Дробны слёзачкі роніць —
— Падайце вясёлачак, падайце чоўночак сюды —
Адклікніся, міленькі, на мой галасочак
Чаўночак зламіўся, вясёлочак сплыў,
А мой міленькі сярод рэчкі ўтапіўся!

— — —

Хто тую гору араў,
Хто тую сцежку таптаў?
Іванька гору араў,
Іванька сцежку таптаў,
Да Ганачкі хадзючы, падарункі насючы —
— Ты Ганачка, адчыні ваконачка —
Адчыні ваконачка трошачку,
Дам табе падарункі
Чырвоны каралечкі, шры— садовы яблачкі.

— — —

## Ярынная песьня

Ды, ўпала вутанька, ўпала,
Ды ў тую цятую травіцу,
У млодзёну расіцу
Ды хто-ж тую вутаньку сагрэе?
Сагрэіць сялезень пад сваймі крыльцамі

—

Запісала Марыля Бараўчак ад сваей маці ў в. Бараўцы Крыз. вол., у восень 1927 г.

# Апавяданьне

## Лазар

Жыў-быў на сьвеце багаты чалавек;
Ён на тот сьвет ні ўмнаваў;
Царквы і касьцёлы ён ні закладаў,
Удаў і сірот ні надзяляў,
Ніводных старцаў у двор ні пушчаў,
Ад убогага Лазара вароты замыкаў.
Тады Лазар голасна закрычаў:
— Браце, мой браце, багаты чалавек,
Дай-жа ты мне хлеба кавалак
солі драбочак
Пра міласьць, пра божаго душу
прапітаць.
Ні ён пітаў, сам Гаспадзь пітаў.
Былі ў багатага два люты пси,
Які каля століка хадзілі,
Хлебныя крохі зьбіралі,
Убогаму Лазару на воз насілі.
Адзінокі пайшоў багаты ў поле гу-
ляць
Паляваць князі, баяры на балях
ішлі
Два люты пси ўпярод ішлі,
Пахваціці багатага ўверх,
Высока расьпялі на піляні
У кінулі душу ў пекла глыбока.
— Вот табе, душа, царства нябеснае
Баяры раскінуліся, два люта
псы
Пашлі ў лес.

---

Записала Марыя Барысёнак
ад сваёй маці, у в. Бартышы,
Прыд. вол., у восені 1927 г.

# Грышачка

(Гумарыстычнае апавяданьне)

Як быў Грышачка дурачок,
Хадзіў, трубіў у кулачок,
Як быў Грышачка з малых лет,
Сказалі, што у яго розуму нет;
Як быў Грышачка пячары,
Пакраў ад бабы сыры;
Павадзіўся ў садок да бабы па мядок,
Баба Грышачку для мёду улавіла,
Калком галаву расшчапіла.
— Грышачка, каток, папасі маю каровку,
А я тваю вылячу галоўку.
Пагнаў Грышачка на пасту,
Упадабаў дзеўку Насту,
Грышачка лапцікі ей плясьцець,
Аж на Настачку міла паглядзець,
А Настачка носіць, за Грышачку бога просіць.
Грышачка зьвіў длінную пугу
І пагнаў бабу каля лугу,
Ня з'еў абеда, пагнаў і дзеда,
Баба бяжыць і дрыжыць
І назад ні глядзіць,
Нужна была бабушке свае здароўе
унясць,
Як можна была Грышачку упрасіць,
Бацька не захацеў такоы мукі,
аддаў Грышачку да дырэхтара ў рукі,
Дырэхтар Грышачку вучыць,

А Грышачка перад дырэктарам маўчыць,
Дырэктар Грышачку як упёк,
Дык Грышачка са школы уцёк,
Прыйшоў дамоў бацькі з маткай пахваліўся,
Што усяго добрага навучыўся
Бацька не захацеў такой мукі,
Аддаў Грышачку пану ў рукі,
А з панам нада ехаць на козлак,
А ў Грышачкі пуга ў вузлах,
Грышачка пугу ня ўкіраваў,
Бабе па патыліце папаў
- Ну, Грышачка, за мае труды,
Дай мне тры рублі,
А за купіцу выкапай крыніцу!
Грышачка бедны чалавек,
Негдзе тры рублі браць,
Пайшоў крыніцу капаць,
Тры разы лапатай капануў
І носам балтануў.
Жыў Грышачка свой век
Ніхто не казаў,
Што Грышачка быў добры чалавек

— " — "

Запісаў С. П. Сахараў 12 лістапада 1938 г. ад Уршулі Нейдборт (па бацьку Белявуская), 74 г., у м Рыга
Сама Нейдборт родам з Глушчаня (веска Варнавічы); часова працавае у Рызе, у сваёй дачкі.

# З народных баек

## Крот

Толькі скончыўшы тварыць сьвет
Бог угледзеў, што німа почым лад-
зіць
Усім аднойчы выдаў загад, каб
старасты таго часу выклікалі-б
на працу ўсё жывое.
(да прыкладу, кажуць, як нас у
часе вайны ў акопы зганялі
рыць іх)
Загад выйшаў рабіць шляхі.
Былі тут гасьцінцы, дарожкі
і сьцежкі. Сярод ніхто не мог
адкупіцца. Усе выйшлі.
Прыйшоў Бог з табліцамі.
У пераклічцы крата не знайшоў.
А крот быў тым часам за-
рыўшыся ў зямлю, каб не пра-
цаваць.
Штрафаў тады ня было,
Бог не штрафаваў і не па-
сылаў на іх ўрадніка
Каб той паеў-бы яшчэ,
Ён толькі сказаў:
— Хай ад веку крот рыецца пад
зямлёю і ня мае права пе-
райсьці дарогу. Моцныя словы
Бога. Вось чаму амаль што
крот пад зямлёй. Іншы раз
выходзе троху, але калі адва-
жыцца ўзьбегчы на шлях — гіне.
Сярод шляхоў шмат іх можна
пабачыць, страціўшых жыцьцё
Божыя кара.

Запісаў бел. вучыцель Мікола
Талерка у лецку 1925 г., у Ма-
лінаўск. вол., Дзьвінск. пав.

# З беларускіх баек

## Чаму ня можна ў сьвята рэзаць

У сьвята стружкаць ня вольна!
Вы ня верыце?
Дык паслухайце! Сьвяткаваць
трэба: крый Бог, што рэзаць.
Самы старшы чорт — Люцы-
пар у пекле на ланцугах
прывязаны да вялікага слупа.
Быў ён адарваўшыся, але яго
злавілі. Слуп дзеравяны,
таўсты, таўсты, але як
хто раз стругнецца, дык
ён-танее.
Прыйдзе час, людзі гэтак
награшацца, гэтак настру-
каюць, што слуп пералo-
міцца! Будзе гэта ў
сьвята. Настане тады
канец сьвету. Усіх тады
Люцыпар пахватае...
і ў пекла.

Запісаў бел. вучыцель
Мікола Таленка, у
летку 1925 г. у Дагдзеніш-
чыне

(Голас Беларуса
№ 22.
1 траўня 1926 год.)

# З народных баек

## На сабачай долі

У старыя, даўныя часы Бог часьцей хадзіў на зямлю паглядзець парадкаў, ды што-колечы расказаць людзям.

У той час людзі жылі амаль так як і цяпер, але ня было тых адстрочак, войнаў, ды ўедак адзін другога. Жылі пад кустамі, бо было цёпла. Сеялі збожжа як і цяпер жыта. Але жыта было не такое. Не хацеў Бог, каб многа працаваў чалавек, дык быў сатварыў жыта без саломы: быў колас у стан чалавека, з верху да нізу. Жалі як і цяпер бабы. Вось прыметаўшы сталі баба на Бога пяняць, што цяжка жыць, дык каб адсохла жыта.

Бог аддыхаючы пад кустом глядзеў як бабы жнуць. Учуў ён жарты, зазлаваў і зрабіў што стала адна салома без колосу. Бабам стала лёгка жыць. Была тады ўжо і сабака. Давай яна круціцца каля Бога і прасіць пашкадаваць яе: кінуць на яе долю хоць-ж трошку каласа пры той саломе, каб не падохнуць. Кінуў Бог колас на сабачую долю. Тым мы і жывём зараз. Чалавекі крыўдзім сабаку, а жывём на сабачай долі.

Запісаў у в. Шмакаво — прыд. вол. Дзвінск. пав. Бел. вуч. Мікола Талерка, ад бабулі Гелены — 1925 г.

# З народных баек і забабонаў

Хворая бабка ляжыць на печы. Да яе лезуць дзеці. Яна іх гоніць, страшыць хваробай.

Урэшце просіць дзеда:

— Бацюдзі зрабі ваду!

— Як?

— Я буду казаць, а ты рабі.

— Кажы.

— Змый крыж на крыжы, вуглы стала па тры разы.

— Змыў.

— Укінь шэсьць вугалькоў з ямкі.

— Укінуў.

— Чытай па трому тры разы ўзяўшы трыма пальцамі солі.

— Чытаў.

— Змоў „Zdrovas Marija"

— Змовіў.

— Зараз — давай: змыюся

— Я дык нешта ня веру ў гэта.

— Дурны! ты і ў бога ня верыш!

Запісаў у Бальбінаўшчыне Крыд. вол. Даўгаўп. пав. М. Паўлісак.

(„Голас Беларуса", № 31. VII 1925.)

## Тлумачаньне - Объяснение - Paskaidrojums,

некаторых слоў з беларускай мовы на расейскую і латыскую мовы, спатыкаючыхся ў песьнях.

Абапал - по обеим сторонам - abās pusēs;
Абмова - оговор - aprunāšana;
Абрус - скатерть - galdauts;
Адпачынак - отдых - atpūta;
Адчыніць - открыть - atvērt;
Акраткі - лапти - pastalas;
Аксаміт - бархат - samts;
~~Асець~~ - ~~[illegible]~~
Асілак - ~~богатырь~~, силач - stiprinieks;
Апранацца - одеваться - apģērbties;
Атопка, пантофля - старый туфель - veca tupele.
Атрута - яд, отрава - inde.

~ . ~

Бачыць - видеть - redzēt,
Благі - плохой - slikts;
Брудны - грязный, нечистый - netīrs;
Бурkaваць - говорить, болтать между собою - runāt, pļāpāt savā starpā.

Вандраваць – странствовать, путешствовать – – ceļot;

Вартасьць – ценность, достоинство, стоимость – – vērtība;

Веляй – брата у невесты – pļīvurs;

Вёска – деревня – ciems, sādža;

Вітаць – приветствовать – sveicināt;

Войт – сельский староста – ciemas vecākais.

~ . ~

Гадаваць – выкармливать,
воспитывать – audzināt;

Галота – голь, беднота – nabadzība;

Гарбата – чай – tēja;

Гаспадыня – хозяйка – saimniece;

Гаспадар – хозяин – saimnieks;

Гузік – пуговица – poga;

Гукаць – звать кого – saukt;

Гультай – лентяй – slinkis;

Гурток – кружок, общества – draudzība, biedrība;

Гучна – звучно – skaļi;

Гук – звук – skaņa.

Дакучаць - надоедать - apnikt;
Дбаць - забытиться - чirpēties;
Дзядзіна - жена дяди - tante;
Дзякаваць - благодарить - pateikties;
patecība - благодарность;
Дрэмко - глухо, пусто - tukšs;
Ёнк - стон, жалобный крык - vaimanas.

~ . ~

Жарт - шутка - joks;
Жартаваць - шутить - jokot;
Жорны - ручная мельница - рокаs dzirnava;
Жыраваць - кормить - barot;
Журба - грусть, тоска - skumjas;

~ . ~

Зажурыцца - загрустить - noskumt;
Збор - собрание - sapulce;
Звалакаць, звалкаць - стаскивать, стащить - novilkt;
Змага - сила, возможность - spēks, izdevība;
Змагацца - достигать чего-нибудь - panākt;
Зязюля - кукушка - dzeguze;
Зыбацца - колыхаться - šūpoties.

Кажарка – кажух – kažoks;
Кашулька – рубаха – krekls;
Каўнер – воротник – apkakle;
Каберау – коврик – grīdsega;
Кахаць – любить – mīlēt;
Кветкі – цветы – puķes;
Квітнець – цвести – ziedēt;
Крыўда – обида – apvainojums;
Крыга – льдина – ledus gabals;
Крыніца – родник, источник – avots;
Кужаль – тонкий лён – lini;
Куффра, куфар – сундук – lāde;
Кут – очек – угол, уголок – kakts, kaktiņš;
Кульбака – седло – segli;
Кульбачыць – седлать кого – seglot;
Крыж – крест – krusts;
Кішэнь – карман – kabats.

Лазьня - баня - pirts;

Лепшы - лучший - labāks;

Ложак - кровать, ложе - gulta;

Луг - луг - pļava;

~~Лады - расчищенная от леса площадка~~ -

Лупы - губы - lūpas;

Ляшчына - орешник - lazda;

Лялея - лилия - lilija;

~ . ~

Магутны - могущественный, сильный - spēcīgs;

Маляваць - рисовать - zīmēt;

Матавіла - мотушка;

Млын - мельница - maltuve, dzirnavas;

Мовіць - говорить - runāt;

Мусіць - должно, иметь необходимость -
- nepieciešamība

Мур - каменная стена - akmeņu siena

Мураваны - каменный, кирпичный -
- akmeņu, ķieģeļu.

Мураваць што - строить из камня или кирпича - būvēt;

Начавіцы - брюкі, штаны - bikses

Намаўляць - наговаривать, наклеветать -
- apmelot, apčināt;

Недалужны - слабосильный, хилый - vārgs;

~ . ~

Паветка - навес - pajume;

Пакой - комната - istaba;

Пакой (таксама азначае - мир, тишина -
- miers)

Панчоха - чулок - zeķe,

Павандраваць - попутешествовать,
поскитаться - paceļot, paklejot;

Паляніцы - блины - bliņas;

Пасварыцца - поссориться - ķildoties;

Пасаг - приданое - pūrs.

Пазайдросьціць - позавидовать - apskaust;

Парада - совет - padoms;

Параіць - посоветывать - dot padomu;

Парткі - ~~брюки~~ кальсоны - ~~bikses~~ apakšbikses.;

Папера - бумага - papīrs;

Пазычыць - одолжить - aizņemt;

Пачуць, чуць - слышать - dzirdēt;

Пачаставаць - угостить - paciemot;

Пачынак - начало - sākums;

Пакаштаваць - попробовать - pamēģināt;

Патрактаваць - угостить - paciemot;

Пахіляцца - сгибаться
согнуться - salocīties;

Пожня - луг - pļava;

Прамень - луч - stars;

Працаваць - работать - strādāt;

Праца - работа - darbs;

Прыгожы - красивый - smuks, skaists;

Прымушаць - принуждать - piespiest;

Прыгарнуць - приласкать - pieglaudīt;

Прыемны - приятный - patīkams;

Пытаць - спрашивать - jautāt;

Пудзіць - пугаць - baidīt;

Пулог - роды - dzemdēšana;

Пужацца - пугаться - baidīties;

Пякота - жар, зной - svelme, tveice;

~ . ~

Рабіць - делать - darīt;

Рада - совет - padoms;

Распранаць - раздевать - noģērbties;

Рыхтаваць - приготовлять - sagatavot;

Рыхтавацца - собираться
готовиться - ~~dviele~~

- taisīties;

Ручнік, рушнік - полотенце -

- dviele.

Сачыць - искать - meklēt;

Скрыня - сундук - lāde;

Скарб - имущество, сокровище - manta;

Слуп - столб - stabs;

Спадніца - юбка - lindraki;

Спадзявацца - надеяться - cerēt;

Спалохацца - испугаться - sabaidīties;

Смага - жажда - slāpes;

Студня - колодезь - aka;

Сум - печаль, сомнение - bēdas, šaubas;

Слушны, сьлічны - дельный, справедливый - taisnīgs;

Сьнеданьне - завтрак - brokastis;

Спаткацца - встретиться - satikties;

Сьпяшацца - торопиться - steigties;

Спазнаваць - узнавать кого, узнать - pazīt;

Сьцежка - тропинка - taka;

Сьцюдзёны - холодный - auksts.

Твар - лицо - seja;

Труна - гроб - zārks;

Тын - изгородь - žogs;

Туга - скорбь, печаль - skumjas, bēdas;

Тутын - табак - tabaks;

Тужыць - скорбеть - skumt, bēdāt;

~ . ~

Улякацца - испугаться - sabaidīties;

~ . ~

Хвароба - болезнь - slimība;

Хварэць - болеть - slimot;

Хмара - туча - mākonis;

Хмарна - туманно - miglaini;

Хурман, фурман - извощик - važonis;

Хустка, ачка - платок, платочек -
- lakats, lakatiņš.

Хусьце - белье - veļa.

Чаравік – башмак – zābaks;

Чакаць – ожидать – gaidīt;

Чырвоны – красный – sarkans;

Чуваць, чуць – слышать – dzirdēt;

~ . ~

Шанаваць – уважать – cienīt;

Шата – дорогая одежда – dārga drāna;

Шавец – сапожник – kurpnieks;

Швагер – свояк, шурин – svainis;

Шкло – стекло – stikls;

Шкадаваць – жалеть – žēlot;

Шкадлівы – вредный – kaitīgs;

Шлюб – венчание – laulāšana;

Шпарка – быстро – ātri;

Шукаць – искать – meklēt;

~ . ~

Юшка – соус – mērce;

~ ~

Ятроўка – невестка – vedekla;

Ядлынец – можжевельник – kadiķis.